Пралетары ўсіх краёў, аднаўчайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 308 (4214)
Субота, 14 лістапада
1931 г.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ — Узьняць работу транспарту на ўзровень агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва (1-я стар.).
КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ І БАРАЦЬБА ЗА САЦЫЯЛІЗМ — даклад тав. В. Молатава на ўрачыстым сходзе Маскоўскага Савету, прысьвечаным 14-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі (2 і 3 стар.).
Полацкія ЦРК і харчпром перахватваюць бульбу, накіраваную ў Ленінград (1-я стар.).
Вопыт і дасягненьні перадавікоў — усяму сацыялістычнаму транспарту (1-я стар.).
Спажывецкая кааперацыя БССР яшчэ ня ўключылася па-баявому ў фінэстафэту (3-я стар.).
Кадры вясковых партарганізацый сёньня папаўняюцца 125 выпускнікамі курсаў партактыву пры ЦК КП(б)Б (4-я стар.).
КІТАЙ: Буйныя баі за Цыцыкар.
ГЕРМАНІЯ: Пастанова ЦК КПГ аб барацьбе з ухіламі.
ФРАНЦЫЯ: Зьезд рэвалюцыйных прафсаюзаў.
ПА СССР: Вынаходзтва машыніста т. Юрчыка.

УЗЬНЯЦЬ РАБОТУ ТРАНСПАРТУ НА УЗРОВЕНЬ АГУЛЬНЫХ ТЭМПАЎ САЦБУДАЎНІЦТВА

Чыгуначны транспарт Савецкага Саюзу, у параўнаньні з мінулым гадам, дабіўся раду посьпехаў у сваёй рабоце. Сёлета ён прапускае грузаў значна больш, чым летась. Аднак, гэтыя посьпехі яшчэ далёка не забясьпечваюць тых узросшых патрабаваньняў, якія прад'яўлены транспарту. Разьбежка паміж тэмпамі работы чыгуначнага транспарту і тэмпамі агульнага развіцьця ўсёй народнай гаспадаркі, усё яшчэ надзвычай вялікая. «Чыгуначны транспарт, ня гледзячы на некаторае павышэньне сваёй работы ў параўнаньні з мінулым годам, усё яшчэ застаецца вузкім месцам і адным з сур'ёзных перашкод у справе пасьпяховага выкананьня народна-гаспадарчага пляну». Так ахарактарызаваў становішча транспарту **кастрычніцкі пленум ЦК УсеКП(б).**

Гэта апошняя цалкам і поўнасьцю адносіцца таму становішчу, у якім знаходзіцца і чыгуначны транспарт БССР. Работа чыгунак як МБВ, так і Заходніх, усё яшчэ застаецца нездавальняючай. Дрэнна пастаўлена работа эксплёатацыі, паравозны і вагонны паркі яшчэ не нагружаны так, каб поўнасьцю выканаць пляны перавозак. Важнейшыя вузлы нездавальняюча падрыхтаваліся да асеньня-зімовых перавозак. Партыйныя арганізацыі ўсё яшчэ не арганізавалі сапраўды бальшавіцкага змаганьня за ўкараненьне спаранай язды, за ліквідацыю абязьлічкі, за павышэньне якасьці рамонту паравозаў і вагонаў.

Амаль на ўсіх вузлах абязьлічка падрывае работу паравознага парку. Дробна - буржуазная ўраўнілаўка ў зарплаце тармозніц павышэньне прадукцыйнасьці працы. Безадказнасьць і непрыхаванасьць у рабоце апарату чыгункі зрывалі выкананьне вымаральнікаў. На **Віцебскім** дэпо за другую палову кастрычніка было 213 выпадкаў, або 11 проц. зрыву спаранай язды. На **Жлобінскім** вузле ў верасьні працавала 7 абязьлічаных паравозаў. Недапушчальна слаба праводзіцца ліквідацыя абязьлічкі і ў **вагонным парку.** Прымацаваньне поўных паркаў да чыгунак і арганізацыя абменных пунктаў адбываецца вельмі павольнымі тэмпамі.

Надзвычай марудна ўкараняецца на транспарце **гаспадарчы разрахунак,** нездавальняюча вядзецца змаганьне ў ураўнілаўкай на аснове ўнядзеньня вядзельна-прэміяльнай аплаты працы. **Працоўная дысцыпліна** — на нізкім узроўні. **Транспартная кааперацыя** не спраўляецца з ускладзенымі на яе задачамі па бесьперабойным снабжэньні рабочых прамтаварамі і прадуктамі харчаваньня, з работай па разгортваньні **грамадзкага харчаваньня.**

«Партыя ня можа дапусьціць у якой-небудзь меры паўтарэньня зімовых перабояў у рабоце чыгунак». Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб ужыць усе меры, скарыстаць усе магчымасьці для таго, **каб работу транспарту ўзьняць на вышэйшы агульных тэмпаў разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.**

Бліжэй падыйсьці да пытаньняў работы на транспарце, мабілізаваць партыйныя масы і ўсіх рабочых-чыгуначнікаў на ажыцьцяўленьне тых мерапрыемстваў, якія вызначаны партыяй па сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту, **на поўную рэалізацыю шасьці ўмоў т. Сталіна і ператварэньне ў жыцьцё загаду тав. Андрэева** — такава задача кожнай партарганізацыі. Больш апэрацыйнасьці, дапамогі і канкрэтнасьці ў кіраўніцтве транспартам! Праграма бальшавіцкіх дзеяньняў дана. Яна ва ўсёй паўнаце вызначана ў спэцыяльнай адозьве ЦК УсеКП(б) і СНК, у пастановах ліпеньскага і кастрычніцкага пленумаў ЦК УсеКП(б). Задача заключаецца ў тым, каб мерапрыемствы, вызначаныя партыяй, цалкам і поўнасьцю **рэалізаваць ва ўмовах кожнай чыгункі, кожнага вузла, станцыі і дыстанцыі.** Для гэтага неабходна павысіць адказнасьць **партыйных арганізацый,** мабілізаваць масы рабочых-чыгуначнікаў на вузлавыя зьвезьні работы транспарту.

Паравозны парк — вядучая частка транспартнай гаспадаркі. Яго аздараўленьне, павышэньне якасьці і прадукцыйнасьці працы павінна заняць цэнтральнае месца ў рабоце ўсіх партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый. Канчаткова дабіць абязьлічку, бязьлітасна выкараняць факты зрываў спаранай язды, строга прытрымлівацца графіку работы паравозных брыгад — асноўныя мерапрыемствы ў змаганьні за здаровы паравоз. Процант хворых паравозаў на нашых чыгунках даходзіць больш, як да 20. Нагрузка паравозаў, іх прадукцыйнасьць працы вельмі нізкая. Калі паравоз пры цягніку знаходзіцца 9 з паловаю гадзін, то рухае цягнік ня больш як 6 гадзін у суткі. У сьвятле гэтага набывае асабліва вялікае значэньне мерапрыемства ўказанае ў загадзе тав. Андрэева, аб **павялічэньні вытворча-карыснай работы паравоза на адну гадзіну ў суткі.**

Вядучы жорсткае змаганьне за ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства, партыйныя арганізацыі максымум увагі павінны аддаць справе павышэньня **якасьці** рамонту паравозаў. Умелая арганізацыя вытворчых працэсаў, правільная расстаноўка рабочай сілы па рамонце паравозаў, забесьпячэньне дэпо запаснымі **часткамі** — вось шляхі, па якіх павінна **ісьці** змаганьне за высокую якасьць рамонту паравозаў.

Задача поўнага выкананьня пляну перавозак патрабуе бальшавіцкай работы на ўпарадкаваньні **вагоннай** гаспадаркі. Ні для кога не сакрэт, што пры вялікім недахваце вагонаў, апошнія шмат часу стаяць пад разгрузкай, пагрузкай і іншымі апэрацыямі, што ва гонны парк нагружан нездавальняюча. У сярэднім вагон знаходзіцца ў руху толькі 7 гадзін у суткі, а рэшту часу знаходзіцца на манэўрах пад выгрузкай, пагрузкай і г. д. Задача заключаецца ў тым, каб скараціць **стаянкі вагонаў** пад апэрацыямі, тэрмін знаходжаньня на манэўрах і **павялічыць іх прабег пад грузамі.** Ліквідаваць абязьлічку вагонаў, максымальна іх нагрузіць за лік скарачэньня тэрмінаў розных апэрацый, павысіць якасьць рамонту, прымацаваць поўныя вагонныя паркі да чыгунак, арганізаваць абменныя пункты — усё гэта патрабуе неадкладнага практычнага вырашэньня.

Палепшэньне **эксплёатацыйнай** работы транспарту павінна прыкаваць быць падхоплен усімі раёнамі БССР. Трэба ў бліжэйшую-ж пяцідзёўку заваяваць перамогу на збожжазагатоўчым фронце ва ўсіх калгасах, саўгасах, сельсаветах і раёнах. Гэта магчыма толькі пры пяўхільным ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі і ўраду, пры разгортваньні сапраўды бальшавіцкіх мэтадаў і тэмпаў работы.

Саўгасы БССР усё яшчэ знаходзяцца ў глыбокім тыле кампаніі. На 10 лістапада яны выканалі толькі 10,2 проц. свайго заданьня. Між тым, саўгасы павінны ісьці ў авангардзе загатовак, першымі поўнасьцю і своечасова скончыць здачу збожжа дзяржаве.

Адстаюць таксама і **калгасы,** якія выканалі толькі 45,3 проц. пляну. Трэба неадкладна ліквідаваць адставаньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ў здачы збожжа дзяржаве. Шляхам шырокага разгортваньня масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў, рашучага змаганьня з правым і «левым» апартунізмам, бязьлітаснага націску на кулацка-заможныя элементы трэба забясьпечыць на працягу лістапада поўную ліквідацыю запазычанасьці перад дзяржавай.

Гэты, найбольш адсталы вучастак транспартнай гаспадаркі зьяўляецца вялікім тормазам у правядзеньні перавозак. Задача заключаецца ў тым, каб выкараніць косасьць і непаваротлівасьць у рабоце адміністрацыйных органаў, дыспэтчэрскага апарату, у станцыйных агентаў.

Партыйныя ячэйкі сваёй бальшавіцкай работай павінны забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне дырэктыў аб маршрутызацыі і спэцыялізацыі цягнікоў, павінны неадкладна ўстанавіць стандартныя нормы прастояў і выразныя расклады падачы і ўборкі вагонаў. Пад асобы кантроль трэба ўзяць плянаваньне перавозак, якое да гэтага часу зьяўлялася вялікім тормазам у разьвіцьці эксплёатацыйнай работы.

Гаспадарчы разрахунак — магутны вагар у правільнай арганізацыі гаспадаркі і скарыстаньні **ўнутраных рэсурсаў.** Між тым, гэта важнейшае мерапрыемства ажыцьцяўляецца вельмі марудна. У Жлобінскім дэпо, на Віцебскім чыгуначным вузле гаспадарчы разрахунак праводзіцца фармальна. На Менскім вузле быў рад скажэньняў прынцыпаў увядзеньня гаспадарчага разрахунку. Абавязак партыйных арганізацый — праверыць становішча пераходу на гаспадарчы разрахунак, ужыць усе меры для таго, каб укараніць яго ў работу ўсіх зьвеньняў транспарту і зрабіць паравоз сапраўды самастойнай гаспадарчай адзінкай.

Арганізацыя **бесьперабойнага снабжэньня рабочых чыгуначнікаў,** паляпшэньне грамадзкага харчаваньня — неадлучнае зьвяно агульнага змаганьня за паляпшэньне работы транспарту. Транспартная кааперацыя павінна перабудаваць сваю работу, пачаць працаваць па-баявому, мабілізуючы ўнутраныя рэсурсы для паляпшэньня снабжэньня рабочых.

Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў трэба цесна зьвязаць з падрыхтоўкай да зімы. Літаральна на працягу некалькіх дзён па ўсіх лініях неабходна закончыць работу па папярэджаньні сьнежных запосаў, падрыхтаваць сьнегачышчальнікі і інш.

Дабіцца баявой работы транспарту партыйныя арганізацыі здолеюць толькі пры ўмове пяўхільнага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна, толькі на аснове бязьлітаснай барацьбы супроць апартунізму, косасьці і «очковтирательства». Дабіцца бальшавіцкіх тэмпаў ва ўсёй рабоце транспарту магчыма толькі на аснове **карыснай перабудовы партыйнай работы,** перанёсшы цэнтр цяжару яе ў пізавое вытворчае зьвяно — цэх, групу, зьмену, паравоз. Задача раённых партарганізацый і транспартных парткалектываў — дабіцца апэрацыйнага дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва пізавымі партыйнымі зьвеньнямі, аказваць ім дапамогу ў штодзённай рабоце. Кожная партячэйка і кожны камуніст павінны пяўхільна павышаць авангардную ролю партыйцаў па вытворчасьці, весьці за сабою ўсю масу чыгуначнікаў. «Справай гонару камуніста на транспарце павінна быць сапраўднае аўладаньне тэхнікай транспарту, уменьне ў кароткі тэрмін павучыцца і стаць кіраўнікам тэй ці іншай галіны арботы ў апараце або на лініі». (З пастановы пленуму ЦК УсеКП(б).

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку"

АСЬВЕЯ, ГОМЕЛЬ І СУРАЖ

ПАКАЗАЛІ ПРЫКЛАД БАЛЬШАВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ЗБОЖЖА

Раўненьне па перадавікох загатовак!

Апошнія даныя «Союзхлеба» аб ходзе збожжазагатовак паказваюць, што належны пералом у гэтай кампаніі яшчэ не наступіў. На 10 лістапада па БССР было загатоўлена ўсяго 51,3 проц. гадавога пляну. Пяцідзёўка з 5 да 10 лістапада дала зусім нездавальняючы прырост—5,1 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што вялікая частка раёнаў БССР не мабілізавалася яшчэ на ажыцьцяўленьне пастановы ЦК КП(б)Б аб загатоўках, якая прапанавала «разгарнуць самую актыўную работу вакол выкананьня пляну загатовак, зараз-жа прыняць меры да выпраўленьня дапушчаных скажэньняў у загатоўках, спыніць усякія гутаркі аб перэпланаваньні і ўзяцьця за іх сапраўды бальшавіцкае выкананьне.

Толькі гэтым можна вытлумачыць той факт, што многія раёны дагэтуль яшчэ не вышлі з тылу збожжазагатоўчай кампаніі. На 10 лістапада Старадорскі раён выканаў 16,8 проц. гадавога пляну, Тураўскі—33,7 проц., Акцябрэбінскі—38,1 проц., Слуцкі—24,5 проц., Пятрыкоўскі—30,2 проц., Прапойскі—36,4 проц., Мазырскі—37,3 проц., Любанскі—31,2 проц., Лельчыцкі—26,0 проц., Клічаўскі—35 проц., Качаргінскі—38,9 проц., Чавускі—38,4 проц., Койданаўскі — 35,2 проц. і г. д.

У той-жа час перадавыя раёны, якія па-бальшавіцку рэалізуюць пастанову ЦК, разгортваюць сапраўдны ударны тэмп работы, вядуць рашучую барацьбу з кулацкімі, сакэвіцкімі элементамі, дабіліся вялікіх перамог на фронце здачы збожжа дзяржаве. **Асьвейскі** раён ужо выканаў свой гадавы плян на 110 проц., **Гомельскі**—на 107,1 проц., **Гарадоцкі**—на 86,9 проц., **Дубровенскі**—на 71,5 проц., **Сураскі**—на 101,1 проц., **Заслаўскі**—на 71,6 проц., **Плешчаніцкі**—на 78,2 проц., **Уваравіцкі**—на 82,7 проц. і г. д.

Прыклад гэтых раёнаў павінен быць падхоплен усімі раёнамі БССР. Трэба ў бліжэйшую-ж пяцідзёўку заваяваць перамогу на збожжазагатоўчым фронце ва ўсіх калгасах, саўгасах, сельсаветах і раёнах. Гэта магчыма толькі пры пяўхільным ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі і ўраду, пры разгортваньні сапраўды бальшавіцкіх мэтадаў і тэмпаў работы.

Саўгасы БССР усё яшчэ знаходзяцца ў глыбокім тыле кампаніі. На 10 лістапада яны выканалі толькі 10,2 проц. свайго заданьня. Між тым, саўгасы павінны ісьці ў авангардзе загатовак, першымі поўнасьцю і своечасова скончыць здачу збожжа дзяржаве.

Адстаюць таксама і **калгасы,** якія выканалі толькі 45,3 проц. пляну. Трэба неадкладна ліквідаваць адставаньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ў здачы збожжа дзяржаве. Шляхам шырокага разгортваньня масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў, рашучага змаганьня з правым і «левым» апартунізмам, бязьлітаснага націску на кулацка-заможныя элементы трэба забясьпечыць на працягу лістапада поўную ліквідацыю запазычанасьці перад дзяржавай.

Перадавыя калгасы перавыконваюць пляны

Калгасы Жыцінскага сельсавету, Стара-Дароскага раёну, адзначылі сьвяткаваньне 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выкананьнем і перавыкананьнем пляну збожжазагатовак. Калгас «Першае мая» здаў 115 проц. свайго заданьня, «Чырвоная Ніва»—100 проц., «Новы Жыцін»—85,6 проц., «Н. Дрычын»—81,3 проц. Перадавыя калгасы ўзялі на буксір адстаючыя калгасы—«Чырвоная Зьмена» і «Майская раніца», якія ўвесь час пляліся ў хвасьце загатовак.

Недапушчальна адстаюць у здачы збожжа аднаасобныя гаспадаркі Жыцінскага сельсавету. Плян выканан толькі на 29 проц. Гэта тлумачыцца яўнай недаацэнкай ролі аднаасобнага сэктару ў збожжазагатоўках з боку кіраўніцтва сельсавету. Масавая работа сярод бедняцкіх і серадняцкіх не разгорнута. Няма таксама націску на кулацка-заможныя гаспадаркі. У выніку ні адна з апошніх ня выканала яшчэ поўнасьцю цьвёрдых заданьняў.

В.

Чырвонымі абозамі суэлітсэр сьвята

КАПЫЛЬ.

У дні сьвяткаваньня 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі калгасы Капыльскага раёну арганізавалі вялікія чырвоныя абозы са збожжам і бульбай. Рад калгасаў — «Пралетары», «Праца № 2», «Культура» і іншыя ўжо выканалі свае гадавыя заданьні на 100 проц.

РК КП(б)Б мабілізаваў актыў раёну ў ліку 60 чал. (апрача упаўнаважаных РВК і камсамолу) для дапамогі мясцовым арганізацыям у правядзеньні загатовак.

195.000 тон—Ленінграду і Маскве

ПОЛОЦКІЯ ЦРК І ХАРЧПРАМ ПЕРАХВАТВАЮЦЬ БУЛЬБУ, НАКІРАВАНУЮ У ЛЕНІНГРАД

Ход адгрузкі бульбы Ленінграду і Маскве (у тонах)

ЛЕНІНГРАДУ			МАСКВЕ		
11-XI 2.146	12-XI 1.934	Усяго 153.478	11-XI 2.269	12-XI 1.417	Усяго 16.122

ВУШАЧЫ. (Спэц. кар. «Зьвязды»). За апошнія дні Вушацкі раён дабіўся некаторага эруху ў загатоўках і адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам. За дэкаду процант адгрузкі павялічыўся з 43 да 65. Аднак, тэмпы работы ні ў якой меры не забясьпечваюць выкананьня заданьняў у тэрмін.

Вушачы — адзін з тых раёнаў, якія даюць асноўную масу бульбы для загатовак. Ён павінен здаць 3970 тон бульбы, ужо адгружана 2290 тон. Застаецца адгрузіць каля 100 вагонаў.

Вушацкі раён мае поўную магчымасьць выканаць заданьне ў максымальна-кароткі тэрмін. Для гэтага патрэбны — бальшавіцкая настойлівасьць і мабілізацыя ўсіх сіл. Гэтага ў значнай меры не хапае Вушацкаму раёну.

Рад сельсаветаў — В. Далецкі, Жарскі, Кубліцкі, Чарапоўшчынскі і Мосырскі адгрузілі бульбы каля 30 проц. пляну. Такое ганебнае адставань не тлумачыцца тым, што самацёк стаў галоўным мэтадам бульбазагатовак у гэтых сельсаветах.

Зусім іншы малюнак мы бачым у тых сельсаветах, дзе наладжана сапраўды бальшавіцкае кіраўніцтва будь базагатоўкамі, дзе дан бязьлітасны адпор аматарам «аб'ектыўных» прычын. Вацлаўскі сельсавет выканаў план загатовак на 105 проц. Плінскі сельсавет падышоў да 100 проц. выкананьня пляну.

Перадавыя калгасы бліскуча даказаў, што добра наладжаная арганізацыя працы, забесьпячэньне правільнага кіраўніцтва загатоўкамі поўнасьцю гарантуюць своечасовае выкананьне важнейшых заданьняў. Вось баявая ка ёна перадавых калгасаў, якія выканалі плян здачы бульбы на 150-200 проц.: «Новы шлях», імя Леніна, «Новае жыцьцё», «Праўда», «Будзь гатоў», «Сьцяг» і «КІМ».

Раённыя арганізацыі замест баявога кіраўніцтва кампаніяй, замяшаліся і аб'ектыўна патурающь рвацка-спажывецкім настроям.

Паасобныя кіруючыя работнікі РК, РВК і Райкалгассаюзу шукаюць розныя адгаворкі: «раён знаходзіцца далёка ад чыгункі, няма калёс, ня было магчымасьці выканаць плян у тэрмін»; прыводзяць довады таго, што раёнам, якія знаходзяцца недалёка ад лініі чыгункі значна лягчэй выканаць заданьні і г. д. Вушацкія работнікі, за мест бальшавіцкай пастаноўкі пытань ня — **раз умовы больш складаныя, трэба больш змаганьня, больш увагі, больш настойлівасьці,** — захапіліся хныканьнем, пасуюць перад цяжкасьцямі.

Калі на сходзе партактыву ў Завячэльскім сельсавеце абгаварвалася пытаньне аб адгрузцы бульбы, старшыня калгасу «Чырвоная Полаччына» тав. **Арціленак** выступіў з яўна апартуністычнай прамовай, імкнуўся даказаць, што плян немагчыма выканаць. Выступленьне апартуніста ня сустрэла на лежнага адпору.

Злачынна адносяцца да загатовак бульбы Полацкія ЦРК і Харчпром, якія перахватваюць бульбу з Вушачаў, прызначаную для адгрузкі Ленінграду. Такімі рвацкімі мэтадамі Полацкаму ЦРК удалося перахваціць каля 500 тон. Ня гледзячы на пратэсты Вушацкіх арганізацый, гэта злачынства працягваецца. Калгасьнікаў, што вязуць бульбу з Вушачаў на ст. Полацак, перахватваюць агенты ЦРК і Харчпрому і адвозяць бульбу на свае склады. Судова-сьледчыя органы чамусьці не сьпяшаюцца пакласьці канец гэтым агідныасьцям.

Засталіся рашаючыя дні выкананьня пляну адгрузкі. Трэба настойліва падкрэсьліць, што **Вушачы маюць усе магчымасьці для поўнага выкананьня пляну.** Вушацкая партарганізацыя павінна даць **руйнуючы адпор ныцікам, якія адступаюць перад труднасьцямі і ідуць на паваду кулацкіх элемэнтаў.**

А. П.

Здаюць бульбу дрэннай якасьці

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. Адгрузка бульбы на ст. Буда-Кашалёўская ідзе нездавальняюча. Бульба паступае самацёкам і зусім дрэннай якасьці.

Райкалгассаюз не правёў ніякай рас тлумачальнай работы сярод калгасьнікаў аб здачы бульбы. Есьць рад выпадкаў дастаўкі дробнай, мокрай, гнілой бульбы, якую ні ў якім разе нельга накіроўваць за межы раёну. 6-га лістапада была дана заяўка на 15 вагонаў бульбы; на станцыю было дастаўлена некалькі фурманак гнілой прадукцыі, якую нельга было грузіць. У гэтым віна праўленьняў калгасаў імя «Палескай праўды» і «Пралетары». Цікава, што старшыня калгасу «Пралетары» сам прысутнічаў пры адборцы бульбы і ні словам не заікнуўся аб якасьці.

Старшыня РВК тэлеграфна перадаў з вёскі Ратнь, што выяжджаюць 225 фурманак з бульбай; замест 225 прыбыло 50 фурманак — амаль уся бульба найшла на тэхнічныя патрэбы, бо яна была мокрай і дробнай, ня прыгоднай для адгрузкі.

Левін.

Зяблева

Не падмяняць масавай работы адміністрацыйнымі загадамі

НА АСНОВЕ ПЕРАКІДКІ НА ВОРЫВА ЎСЁЙ АСНОЎНАЙ МАСЫ ЦЯГІ ДАБІЦЦА ВЫКАНЬНЯ ПЛЯНУ ЗЯБЛІВА ДА НАСТУПЛЕНЬНЯ МАРОЗАЎ

Так не змагаюцца за зябліва

Койданава: (ад наш. спэц. кар.). Ня гледзячы на пацяпленьне, койданаўскія раённыя кіруючыя арганізацыі не мабілізавалі мас калгасьнікаў на выкананьне пляну зяблева. У Койданаўскім раёне павінна быць узарана 30.000 гэкт. На 11-га-ж лістапада выканана толькі 39 проц. пляну.

Здавалася-б, што на выкананьне зяблевага ворыва раённыя, асабліва зямельныя органы—райзаг, калгассаюз, МТС—павінны былі мабілізаваць усю грамадзкасьць раёну. Але яны прыдумалі іншае: замест разгортваньня шырокай масавай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў райвыканком 5-га лістапада выдаенаступны, за подпісам старшыні РВК тав. **Гравіта,** загад:

„Старшыням сельсаветаў, дырэктару МТС, дырэктарам саўгасаў, старшыням калгасаў, упаўнаважаным РВК па сельсавеце і **начальніку міліцыі.**—Катагарычна патрабуем да 7-га лістапада закончыць уборку і перавораньне бульбы і гародніны. Пераключыць усе трактары і конскую сілу на зяблева. Сельсаветам на працягу 6 гадзін давесьці плян зяблева да кожнага калгасу на дзёх. **Начальніку міліцыі праз свой апарат праверыць выкананьне загаду і вінаватых у невыкананьні прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці.**

Адміністрацыйным загадам падмяніўшы масавую работу, Койданаўскі РВК жадаў правесьці важнейшую палітыка-гаспадарчую кампанію.

Дырэкцыя МТС яўна недаацэньвае зяблевай кампаніі і ўпарта **не выконвае дырэктыў аб пераключэньні трактароў на зяблева.** З 44 трактараў, якія ёсьць, на зяблеве працуюць усяго 28, а рэшта скарыстоўваецца на іншых работах. За апошнюю дэкаду, з 1 па 10 лістапада, МТС выканала плян зяблева толькі на 4 проц.—з 35 да 39 проц.

Койданаўскі райком КП(б)Б павінен рашуча ўдарыць па фактах голага адміністраваньня, недаацэнцы конскай цягавай сілы дабіцца пераключэньня ўсіх трактраў на зяблева. Трэба павесьці шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў і мабілізаваць усе сілы на выкананьне пляну зяблева.

Л.Я.

Кокі у хлявох

ПУХАВІЧЫ. (Наш спэцкор.). Пухавідкі раён павінен зазяблець 32.000 гэкт. Плян выкананы на 34% на 20 кастрычніка.

З гэтай даты райза і райкалгассаюз на сутнасьці спынілі кіраўніцтва кампаніяй.

Весткі сельсаветаў ляжаць цэлымі грудамі на сталах райза і не аналізуюцца. Агранам райза тав. **Кедрык** тлумачыць гэта тым, што загадчык райза паехаў на раён.

Калгасы па прыблізных падліках на 10 лістапада выканалі 67,9% пляну. Мала, бо ня было канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку райкалгассаюзу, што гэтае кіраўніцтва замяніла стаўка на самацёк. Паводле пастановы Калгаспэнтру ў райкалгассаюзе павінен быць вылучан член праўленьня, які адказвае за выкананьне пляну зяблева. У «выкананьне» гэтай дырэктывы «адказны» вылучан... статыстык райкалгассаюзу. Райкалгассаюз займаецца бюракратычным перапісваньнем пастаноў Калгаспэнтру, дарочы, няўдалым.

Існуе поўная блытаніна ў плянах, якія даны калгасам. Напрыклад, калгас **«Новае лядцо»** адзін раз атрымлівае плян на 235 гэкт., другі раз—на 180.

Праверкай перакідкі цягі на зяблева райкалгассаюз і ня думаў займацца. Прычым старшыня райкалгассаюзу тав. **Катлінскі** заяўляе, што ў калгасах уся сіла скарыстоўваецца на выкананьні пляну загатовак і дарожным будаўніцтве. Гэта яўнае «очковтирательство».

За довадамі далёка хадзіць ня прыходзіцца. Напрыклад, калгас **«Новае лядцо»** (Навасёлкаўскі сельсавет). Ён павінен зазяблець 235 гэкт. На сёньняшні дзень зазяблена толькі 30 гэкт. — 13%. Як-жа скарыстоўваецца конская цяга ў калгасе? Аказваецца, што 50% коняй стаяць у хлеве, а 11 лістапада было запята на рабоце ўсяго 17 коняй, 53 гуляла. Пастаянныя брыгады на ворыве не вылучылі і гэта пры наяўнасьці 66 працаздольных мужчын.

Такое-ж становішча і ў калгасе імя газэты «Калгасьнік Беларусі».

Асабліва адстаюць буйныя калгасы. Так, арцель **«Энергія»,** Блускага сельсавету, з 233 гэкт. зазябліла толькі 10, **«Асаавіахім БССР»,** Блонскага сельсавету, з 251 гэкт. — 140 і г. д. Забясьпечыць рашучы пералом, мабілізаваўшы на зяблева шырокія масы і перакінуўшы на ворыва ўсю цягавую сілу.

Б. Х.

Выканаць загад тав. Андрэева!

Вопыт і дасягненьні перадавікоў—усяму сацыялістычнаму транспарту

Зьмена шпал, паводле мэтаду Кацуры, дае бліскучыя вынікі

ПАРУШЭНЬНІ ГРАФІКАЎ НА СТ. МАГІЛЕЎ—ВЫНІК АБЯЗЬЛІЧКІ

Бюро ЦК чыгуначнікаў 31-га кастрычніка заслухала даклады лепшых ударных брыгад па зьмене шпал са станцый **Гомель, Жлобін, і Талачыно** —аб іх рабоце.

З дакладу брыгадзіраў высьвятлілася, **што лепшай зьяўляецца ўдарная брыгада станцыі Гомель, пад кіраўніцтвам брыгадзіра тав. Клімовіча.**

Брыгада **тав. Клімовіча** ў складзе 5 ударнікаў кожны дзень зьмяняла на 31 шпалы на чалавека, замест 14 паводле пляну.

Заданьне па зьмене пераводных брусоў выканана ў 36 гадзін замест 103. Па камбінаваным сярэднім рамонце брыгада рабіла штодзённа 17 пагонных мэтраў замест 11. Плян трэцяга кварталу выканан на 147 проц.

Уся брыгада 10 раз у месяц наведвае заняткі гуртка па аўладаньні тэхнікай. На працягу 3-х месяцаў ударнікамі брыгады т. Клімовіча ўпесена 20 прапаноў вытворчага характару.

Добрых паказальнікаў у выкананьні трансфіпляну дабілася і брыгада тав. **Мітрафанава** (Жлобінскі раён). Гэта брыгада ў ліку 4-х ударнікаў у 8-гадзінны работы дзень зьмяняла 31 шпалу на чалавека. На падёмцы шляху брыгада рабіла на 20 пог. мэтраў у дзень, пры норме 11,5 пог. мэтраў.

Ударная брыгада **Ганчарова** (станцыя Талочыно), дзяжуючы новым мэтадам работы, таксама значна перавыканала свой трансфіплян.

У чым сакрэт бліскучых посьпехаў? Справа ў тым, што памянёныя брыгады ў БССР перайшлі на новую паточную сыстэму зьмены шпал, якую выступіў **тав. Кацура.**

Мэтад кладкі шпал т. **Кацуры** заключаецца ў наступным: Адкопваецца шпала з падрывам яе пасьцелі на 2-4 сантым. тры. Гэта дае магчымасьць аднаму чалавеку лёгка вываліць шпалу, палягчае работу на замене падбіўкі шпалы падштопкай і забіўкі клінчатай падкладкі пад рэльсы і г. д.

Галоўнае, чаго дабіўся Кацура,—гэта правільнай расстаноўкі сіл рабочых. Арцель у 5 чалавек па мэтадзе Кацуры разьбіваецца на 4 групы. Першая--рабочы № 1 адрывае янчыкі. Другая група—рабочы № 2 і 3 расшываюць шпалу, выбучаюць падкладкі, выцягваюць старую шпалу, падчышчаюць пасьцель для новай, зацягваюць яе і падштопваюць. Трэцяя група —рабочы № 4 забівае падкладкі пад рэйкі і прышывае шпалу. Чацьвертая група—рабочы № 5 падбівае шпалу толькі пад рэйкай з абодвух бакоў і затыкае янчык баластам.

Брыгады т.т. Клімовіча, Мітрафанава і Ганчарова, якія працуюць па сыстэме тав. Кацуры, аднагалосна заяўляюць, **што гэта сыстэма дае бліскучыя вынікі.**

Чыгуначныя арганізацыі БССР павінны бездакладна рэалізаваць загад тав. **Андрэева** аб пашырэньні лепшага вопыту работы на ўсе чыгункі.

Н. ГАФТ.

Паравозы чакаюць распараджэньняў

На станцыі **Магілеў** штодзённа парушаецца графік сьледваньня цягнікоў. Па станцыі панае абязьлічка і за зрыў пляпавай работы ніхто не нясе адказнасьці.

Начальнік станцыі тав. **Урублеўскі** заяўляе, што цягнікі адмяняюцца **«па розных прычынах».** Якія-ж гэт прычыны? Па-першае кандуктарскія і змазачныя брыгады своечасова не зьяўляюцца. Далей, несвоечасовая падрыхтоўка цягнікоў, няправільнае сартаваньне вагонаў і дакумантаў да іх, кепскае рэгуляваньне руху на вучастках — вось асноўныя тормазы.

Бюракратычныя адносіны начальніка станцыі і частыя выпадкі галавацяпства з боку дзяжурных па станцыі і дыспэтчараў не даюць магчымасьці наладзіць работы.

Дзяжурны па станцыі тав. **Іваноў** 1-га лістапада ноччу назначыў цягнік для адпраўленьня на **Віцебск,** але пасьля таго, як кандуктарская брыгада была выклікана, гэты цягнік чамусьці быў адменен. Калі-ж кандуктарская брыгада зьявілася назад, дык тав. Іваноў параніў усё-ж адправіць гэты цягнік у 3 гадз. 45 мін. ночы.

31 кастрычніка цягнік № 633 павінен быў быць накіраван у **Гомель,** але таксама быў адменен таму, што **Іваноў** своечасова не праверыў гатоўнасьці цягніка да адпраўкі.

4 лістапада рабочы цягнік, які павінен быў пайсьці на станцыю Друць быў затрыман па паўтары гадзіны з тэй прычыны, што дзяжурны **Сьмятанін** своечасова ня выклікаў кандуктарскую цягніковую брыгаду. Такія штукі дзяжурных па станцыі здараюцца вельмі часта. Пры чым, прычыны і канкрэтныя вінаватыя ў зрывах нармальнага руху цягнікоў нідзе і нікім ня фіксуюцца.

Да гэтага часу не ўстаноўлены кантрольныя пасты для прыбываючых і адыходзячых паравозаў, у выніку часто, многія паравозы стаяць на станцыі лініі гадзіны. Між тым, начальнік дэпо ня раз папярэджваў начальніка станцыі тав. **Урублеўскага,** аб неабходнасьці стварэньня кантрольных постаў, але ён да такіх дробязяў не прыслухоўваецца.

Партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі службы руху ня сталі на чале ажыцьцяўленьня загаду тав. **Андрэева** і разгортваньня сацпераборніцтва і ўдарніцтва.

Ганебная работа, якая мае месца на станцыі **Магілеў,** патрабуе рашучага пералому і, у першую чаргу, узманеньня кіраўніцтва партыйнай і прафесыянальнай арганізацый.

Брыгада друку: **Прахарэнка, Скогец**

Кастрычніцкая рэвалюцыя і барацьба за сацыялізм

(Даклад тав. В. МОЛАТАВА на ўрачыстым сходзе Маскоўскага савету, прысьвечаным XIV гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі—6 лістапада)

1. Да пытаньня аб суадносінах сіл сацыялізму і капіталізму

Таварышы! Чатырнаццатая гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі — важнейшая дата ў гісторыі барацьбы пралетарыяту за сваё вызваленьне.

Чатырнаццаць год таму назад рабочая кляса нашай краіны скінула панаваньне капіталістаў і, ацаўшы на чале ўсёй масы працоўных, прыступіла да пабудовы новага, сацыялістычнага грамадзтва на асновах сацыялізму.

За гэтыя гады намі пройдзен трудны шлях барацьбы з варожымі клясавымі сіламі. Ня толькі ўнутры краіны клясавы вораг аказваў шалёнае супраціўленьне будаўніцтву сацыялізму. Гэта будаўніцтва было зьвязана з асабівымі трудноцямі ў моц таго, што ССР — першая ў сьвеце рабочая дзяржава, як-бы сьціснут непрымірымаворожым яму зьнешнім капіталістычным акаружэньнем.

На глядзячы на ўсе гэтыя труднасьці, цыкліны ок гэтыя годы гігантка працуючых аперад, ва многім умацаваўшы свае пазыцыі. І таму на пароге пятнаццатага году Кастрычніцкай рэвалюцыі мы маем права сьцьвярджаць, што існуюць дзве асноўныя грамадзкія сілы — сацыялізм і капіталізм, барацьба якіх і вызначыцца асноўная лінія суьветнага развіцьця.

У суадносінах гэтых дзьвёх асноўных сусьветных сіл адбыліся за гэтыя годы немалыя зьмены. Пры падыдзеньні выпікаў першых год Кастрычніцкай рэвалюцыі рэшаючае значэньне мае адказ на пытаньне аб тым, у чым іменна заключаецца кола зьмена ў суадносінах сіл сацыялізму і капіталізму.

Аглядываючыся назад, рабочая кляса з гонарам можа сьвяціць, што пройдзен вялізарны і крытны сапраўды керамжны шлях. Капіталізм ужо нератварыўся ў магутнае і крытны шпарка ўзрастаючую сілу. Яго асноўная лінія развіцьця ўнутры краіны знайшла сваё выяўленьне ў пасьлядоўненьні, што ўсё паскарэньне, і лякцы капіталістычных форм

У перадвоенных разгортваньні сіл сацыялізму на ўсім фронце.

У ваенных умовах, на ўмовах найгнабчэйшага эканомічнага крызісу ў капіталістычных краінах, процілеглась шляхоў развіцьця сацыялізму і капіталізму прадэманстравана а асабліва сілай.

Цяпер ужо ніяка такой капіталістычная краіны, якая стояла-б на-за эканомічным крызісам. Капіталізм усё глыбей спускаецца ў яму сусьветнага крызісу. У радзе краін крызіс зацягнуўся ўжо на два гады і нават больш. Але яшчэ ніяка ніяк аднак яго скончэньня. Наадварот, з кожным днём сусьветны крызіс усё больш падточвае капіталістычныя позіцыі.

Так, лінія развіцьця сацыялізму і капіталізму ідзе ў проста процілеглым напрамку. Сацыялізм ідзе пераможна ўверх, на подъем. Капіталізм усё больш забіраецца ў сваіх супярэчнасьцях і пад цяжарам сусьветнага крызісу трацінь адну пазицыю за другой.

Аб гэтых асноўных лініях у развіцьці сацыялізму і капіталізму красамоўна сьведчаць шматлікія факты.

Возьмем, верш за ўсё, факты, якія адносяцца да росту прамысловай вытворчасьці за вызначаны перыяд.

За вызначаны перыяд у радзе капіталістычных краін быў поўны ўздым у прамысловым развіцьці. Эканомічны крызіс з кожным днём усё больш зьядае тыя нарадзільна скромныя посьпехі, якія былі дасягнуты капіталістычнымі краінамі за гэты перыяд. Цяпер мы ўжо маем такое становішча, калі агульны ўзровень прамысловай вытворчасьці краін капіталізму ўсяго на некалькі процантаў вышэй даваеннага ўзроўню. Больш таго. У такой перадавой капіталістычнай краіне, як Германія, мы маем нават значна горшае становішча. Тут узровень прамысловай вытворчасьці ў даны момант скаціўся да таго становішча, якое германская прамысловасьць мела, прыкладна, трыццаць год таму назад.

Такім чынам, зараз ужо нельга гаварыць аб якіх-небудзь сапраўдных посьпехах капіталізму за пасьляваенны перыяд.

Зусім іншае становішча ў нашай краіне, у краіне, дзе будуецца сацыялізм.

У СССР нараўнаньне сучаснай прамысловай вытворчасьці з даваеннымі ўзроўнямі дае цэлы іншы малюнак. Тут ужо зараз мы маем такі ўзровень прамысловай вытворчасьці, які больш, чым у два з паловай разы перавышае ўзровень даваеннага часу. І да таго-ж ва ўсіх на вачох разгортваецца такое будаўніцтва ў галіне індустрыі, якое забясьпечвае з кожным годам усё больш далёкіны рост прамысловай прадукцыі.

Значныя, пераможныя посьпехі сацыялізму ў галіне індустрыі бясспрэчны.

Возьмем пытаньне аб становішчы рабочае кясы ў краінах капіталу і ў Савецкім Саюзе. Аб гэтым легш за ўсё гаварыць фактамі, якія адносяцца да беспрацоўя і заработнай платы.

У краінах капіталізму беспрацоўе дасягнула вачэтных разьмераў. Тут армія беспрацоўных дасягаюць ужо дзесяткаў мільёнаў. Беспрацоўе ня толькі не зьмяншаецца, але ахапляе ўсё новыя мільёны рабочых. Сотні тысяч і мільёны беспрацоўных даведзены да простага галаданьня і да поўнага ўбогага стану. У некаторых краінах беспрацоўныя і паўбеспрацоўныя складаюць ужо больш паловы ўсёй масы рабочае кясы. Становішча беспрацоўных з кожным днём становіцца ўсё больш распачаяным.

У СССР ня існуе беспрацоўя. У краіне сацыялізму будуюцца новыя фабрыкі і заводы, адкрываюцца новыя прадпрыемствы-гіганты. Кадры занятых у прамысловасьці рабочых няўхільна растуць, і цытым з кожным годам усё шпаркей. У прамысловых раёнах у нас нялікі недахват рабочых.

Але гэтага мала. Для становішча рабочае кясы ня менш важны тыя факты, якія адносяцца да пытаньня аб заработнай плаце.

Ні ў адной капіталістычнай краіне зараз няма і вугарні аб прыбаўках заработнай платы рабочым і служачым. Наадварот, кожны новы дзень прыносіць новае зьніжэньне зарплаты для тэй ці іншай прасловкі рабочае кясы. Побач са шпаркім ростам ліку беспрацоўных ідзе грабежніцкае зьніжэньне зарплаты рабочых, якое праводзіцца капіталістамі пры падтрыманьні дзяржаўнай улады і пры актыўнай садзейнасьці сацыял-дэмакратыі.

Толькі ў СССР няўхільна праводзіцца палітыка паляпшэньня матар'яльных умоў жыцьця рабочае кясы. Заработная плата рабочых павышаецца тут з кожным годам. Як вядома, апрача праведзенага ў гэтым годзе значнага павышэньня зарплаты работнікаў чыгуначнага і воднага транспарту, толькі нядаўна было праведзена новае павышэньне заработнай платы для рабочых вугальнай прамысловасьці і металюргіі, а таксама значнае павышэньне зарплаты для ўсёй масы настаўніцтва.

Можна было-б падаць яшчэ нямала фактаў таго, як пагоршваюцца ўмовы жыцьця рабочых у краінах капіталу і як, адначасова з гэтым, ідзе пад'ём матар'яльных і культурных умоў жыцьця рабочае кясы ў нашай краіне. Але і сказанае ідзе даволі яркае сьвятло на становішча рабочых у краінах капіталізму і ў сацыялістычнай рэспубліцы Саветаў. Толькі ў краіне пралетарскай дыктатуры перад рабочым адкрыта шырокая магчымасьць сапраўднага пад'ёму матар'яльных і культурных умоў жыцьця.

Карэнная розьніца ў становішчы працоўных вёскі ў капіталістычных дзяржавах і ў краіне Саветаў таксама зусім відавочна.

У краінах капіталізму мільёны сялян перажываюць зараз выключна цяжкі час. Сусьветны крызіс і ідучае разам з ім скарачэньне прамысловай вытворчасьці, а, значыцца, і скарачэньне попыту на сельска-гаспадарчы сырэц і іншыя сельска-гаспадарчыя прадукты, б'е па вёсцы і, асабліва, на асноўнай сялянскай масе. Зрыўнаваньне сялян пад цяжарам эканамічнага крызісу, а таксама падатковага ярма, якое навалічылася, адбываюцца цяпер з асабівай шпаркасьцю.

Няма чаго ўжо гаварыць аб тым, што становішча працоўных мас у калёніях і поўкалёніях надзвычай цяжкае. Тут зьбядненьне вёскі даходзіць да апошняй ступені. Пяцьдзесяць капіталістычныя краіны імкнуцца да таго, каб перакласьці галоўны цяжар эканамічнага крызісу на прыгнечаныя імі калёніі і залежныя ад іх краіны. Ад гэтага гнёт імпэрыялізму і ўбоства ў рабочых і сялянскіх масах тут дасягаюць крайніх межаў.

Зусім іншае становішча ў нашай рабоча-сялянскай дзяржаве.

У Савецкім Саюзе ідзе ўздым сельскай гаспадаркі, перш за ўсё дзякуючы шпаркім посьпехам калектывізацыі. Стварэньне буйной калектывізаванай гаспадаркі, якая апіраецца на перадавую тэхніку—трактары, камбайны і г. д., значна палягчае работу селяніна, падымае прадукцыйнасьць яго працы, вядзе да агульнага паляпшэньня яго жыцьця. Узрастаючы ўздым сельскай гаспадаркі і няўхільнае паляпшэньне матар'яльна-культурных умоў жыцьця сялянскіх мас зьяўляюцца адным з важнейшых посьпехаў Кастрычніцкай рэвалюцыі за мінулыя гады.

Такавы факты, якія адносяцца да разьвіцьця прадукцыйных сіл і становішча працоўных мас у краінах капіталу —з аднаго боку, і ў краіне Саветаў—з другога.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што зараз справа ідзе ня толькі аб пагоршаньні становішча ў тэй ці іншай асобнай капіталістычнай краіне. Пытаньне заключаецца нават ня толькі ў тым, што капіталістычныя краіны ўвайшлі ў паласу найгнабчэйшага эканамічнага крызісу. Справа ідзе аб большым. Факты, лік якіх шпарка ўзрастае, сьведчаць аб тым, што капіталізм — капіталізм, як асобная грамадзкая сыстэма,—увайшоў у паласу ўпадку, у паласу ўсё больш пагляблёнага і яўна бязвыхаднага агульнага крызісу.

Факты грамадзкага разьвіцьця ўсё больш рашуча гаворацъ супроць капіталізму ў цэлым. І, разам з тым, гэтыя факты ня менш рашуча гаворацъ у карысьць нашай справы, у карысьць наближэньня канчатковай перамогі сацыялізму над усёй капіталістычнай сыстэмай.

Такава асноўная тэндэнцыя разьвіцьця ў суадносінах сусьветных сіл—сацыялізму і капіталізму.

Капіталізм дажывае свой век. На зьмену яму ідзе лад сацыялізму. Факты сусьветнага разьвіцьця сьведчаць аб тым, што прадпасылкі для зьвяржэньня капіталізму ва ўсім сьвеце шпарка насьпяваюць. Гэтыя факты ўсё больш красамоўна гаворацъ аб тым, што Кастрычніцкая рэвалюцыя была ня толькі вялікай рэвалюцыяй рабочае кясы нашай краіны, але што Кастрычніцкая рэвалюцыя зьяўляецца пераможным пачаткам міжнароднай сацыялістычнай рэвалюцыі. Вялізарнейшае гістарычнае значэньне Кастрычніцкай рэвалюцыі заключаецца ў тым, што яна адкрыла новую эпоху ў разьвіцьці ўсяго чалавецтва. Пройдены ёю шлях і кожны новы дзень у цяперашнім разьвіцьці асноўных сусьветных грамадзкіх сіл з бясспрэчнай яснасьцю пацьвярджаюць, што мы жывем у эпоху шпарка нарастаючай міжнародный пралетарскай рэвалюцыі, у эпоху набліжэньня краху ўсёй капіталістычнай сыстэмы, у эпоху набліжэньня поўнай перамогі сацыялізму.

Прайшло 14 год, а наша краіна яшчэ застаецца адзінай у сьвеце сацыялістычнай дзяржавай Саветаў. І ўсё-ж толькі сляпому ня відаць, што справа перамогі міжнароднага сацыялізму гігантскімі крокамі прасоўваецца наперад.

Трудносьці барацьбы пралетарыяту ў капіталістычных краінах таму так вялікія, што вырашэньне ўнутраных пытаньняў барацьбы рабочых з капіталістамі ўсё больш непарыўна сплятаецца з вырашэньнем міжнародных задач барацьбы пралетарыяту з буржуазіяй. Інтарэсы капіталістычных дзяржаў настолькі перапляліся і настолькі гэта перапляценьне ўзмацняецце з кожным годам, што вырашэньне задач барацьбы за сацыялізм у адной краіне ўсё больш сплятаецца з вырашэньнем міжнародных праблем барацьбы паміж працай і капіталам, паміж пралетарыятам і імпэрыялізмам.

Гэта азначае, з аднаго боку,—узрастаньне трудносьцяй для перамогі пралетарыяту ў асобнай капіталістычнай краіне. Але гэта, разам з тым, азначае, што новы сапраўдны посьпех барацьбы рабочае кясы ў тэй ці іншай капіталістычнай краіне будзе з выключнай сілай штурхаць уперад усю справу міжнароднай перамогі сацыялізму. Такім чынам, посьпехі барацьбы рабочых у асобнай краіне цяпер усё больш сплятаюцца са справай барацьбы ўсяго міжнароднага пралетарыяту за вызваленьне ад імпэрыялізму.

Гісторыя Кастрычніцкай рэвалюцыі паказвае, як гэта можа адбывацца на практыцы.

Добра вядома, што пралетарыяту нашай краіны прышлося за гэтыя галы весьці барацьбу ня толькі супроць пастаянных спроб арганізацыі эканамічнай блёкады, але і супроць простай ваеннай інтэрвэнцыі з боку імпэрыялістычных дзяржаў. Толькі дзякуючы таму, што працоўныя нашай краіны, пры падтрыманьні рабочых у капіталістычных краінах, знайшлі ў сабе даволі сіл для таго, каб разграміць клясавага ворага ўнутры краіны і адбіць разам з тым напад замежных імпэрыялістычных сіл,—толькі дзякуючы гэтаму Кастрычніцкая рэвалюцыя пераможна сьвяткуе сваё чатырнаццацігодзьдзе.

Але ясна, што ўрок нашай барацьбы павінен быць прадуман змагарамі за сацыялізм ва ўсіх краінах.

Варочаюся да асноўнага пытаньня, пытаньня аб тым, што гаворыць нам вынікі чатырнаццацігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі аб асноўнай лініі разьвіцьця ў суадносінах сіл—сацыялізму і капіталізму. Гэта разьвіцьцё гаворыць за нас, за справу сацыялізму і супроць нашых ворагаў, супроць капіталізму. А гэта значыць, што асноўная лінія суьветнага разьвіцьця ідзе ў напрамку перамогі міжнароднай справы сацыялізму над імпэрыялізмам. На пароге пятнаццатага году Кастрычніцкай рэвалюцыі мы можам з гонарам сказаць, што перамога сусьветнага бальшэвізму паблізкаецца з вялізарнай шпаркасьцю, што яна набліжаецца нарастаючымі тэмпамі.



2. Кастрычніцкая рэвалюцыя і задачы бягучага моманту

Кастрычніцкая рэвалюцыя мае сваю гісторыю.

Гэта Гісторыя — гісторыя вялізарнейшых перамог. Галоўныя з гэтых перамог ляжаць па лініі канчатковага заваяваньня сялянскіх мас на бок пралетарыяту.

Ленін указваў на тое, што іменна ў гэтым павінна заключацца наша галоўная задача, да перамогі сацыялізму ў адной ці некалькіх перадавых капіталістычных краінах. З гэтага пункту погляду асабліва важны два рашаючыя этапы ў разьвіцьці Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Першы з іх адносіцца да восені 1918 году, калі сацыялістычная рэвалюцыя на-сапраўднаму шагнула з гораду ў вёску. І другі — да 1929 году, калі адбыўся, нарэшце, канчатковы паварот да сацыялізму ў асноўнай сялянскай масы, у серадняцкоў.

Гэтыя два этапы маюць рашаючае значэньне для справы сацыялізму ў нашай краіне. Гэтыя дзьве даты — 1918 і 1929 гады — вехі перамог сацыялізму на самым адсталым і цяжкім гаспадарчым фронце, на фронце сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Значэньне слаўных перамог пралетарыяту ў Кастрычніцкую рэвалюцыю характарызуецца больш за ўсё тым, што мы ўжо маем абсалютную перавагу сацыялістычных форм гаспадаркі ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы. Ня толькі ў прамысловасьці капіталістычныя элемэнты біты, але і ў сельскай гаспадарцы, г. зн. у найбольш адсталай галіне народнай гаспадаркі, посьпехі сацыяльнай калектывізацыі і будаўніцтва саўгасаў забясьпечылі пануючае становішча сацыялістычных форм над капіталістычнымі, дый над дробнаўласьніцкай сялянскай гаспадаркай.

Такім чынам, у барацьбе сацыялістычных і капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне сацыялізм атрымаў перамогу. На ленінскае пытаньне — «хто каго?», — ці пераможа сацыялізм капіталістычныя элемэнты, ці, наадварот, капіталістычныя элемэнты зломяць рост сацыялізму, мы маем ужо вычарпальны адказ. Рабочая кляса, апіраючыся на пераважную масу сялянства, аб'яднана ў калгасы, атрымала перамогу над капіталістычнымі элемэнтамі. Тым самым справа сацыялізму ў нашай краіне поўнасьцю і канчаткова забясьпечана.

Такавы цяперашнія прадпасылкі нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Сутнасьць-жа нашых бягучых задач выцякае з прынятага савецкай уладай пяцігадовага пляну.

Увага ўсёй рабочай кясы і працоўных нашай краіны сканцэнтравана на пяцігодцы, на яе ажыцьцяўленьні. Наколькі мы пасунуліся наперад у гэтай справе і што патрабуецца для далейшых посьпехаў у ажыцьцяўленьні пяцігодкі — вось пытаньні, якімі, перш за ўсё, жыве цяпер рэспубліка рабочых і сялян. Мы з найвялікшай увагай адносімся ідэі гэтым ня толькі да таго, што гаворацъ унутры і за межамі краіны Саветаў нашы прыяцелі і аднадумцы, але і да таго, што гаворацъ аб гэтым нашы ідэйныя праціўнікі і клясавыя вораги.

Зараз варта ўспомніць аб адной з шматлікіх заяў, зробленых насьля апублікаваньня прынятага партыяй пяцігадовага пляну. Я маю на ўвазе вядомую заяву П. Шэфэра — вядомага буржуазнага журналіста з газэты «Бэрлінэр Тагеблят», выгнанага ў свой час з СССР за поўшчыёнскую антысавецкую работу. У той час П. Шэфэр даволі ярка выявіў настрой пэўнай часткі буржуазных колаў заграніцай, выказаўшы наступную думку: «калі, — гаварыў ён у сярэдзіне 1929 г., — пяцігодка ўдасца нават толькі на тры чвэрткі, дык ня прыдасьцца сумнявацца ў канчатковай перамозе сацыялістычнага мэтаду ў Эўропе».

Мы павінны цяпер напомніць аб гэтых словах нашага палітычнага ворага. Тым больш, што сказанае тады лёгка цяпер праверыць фактамі.

І вось да чаго прыводзіць гэта праверка.

Яшчэ рана, вядома, гаварыць аб канчатковых выніках бягучага гаспадарчага году. Пакуль можна рабіць толькі папярэднія вывады. Але гэтыя апошнія ўжо даюць упэўненьне аб асноўных выніках 1931 г.

За апошнія месяцы мы маем значнае паляпшэньне ў нашай прамысловасьці. Калі ў першыя месяцы бягучага году рад галін прамысловасьці знаходзіўся ў цяжкім становішчы, асабліва ў розультаце значных недахопаў у рабоце чыгуначнага транспарту, дык у апошні час ёсьць паляпшэньне па ўсёй лініі індустрыі. Гэта павінна ў значнай меры перакрыць недахопы ў рабоце прамысловасьці за першыя месяцы.

Ва ўсякім выпадку, вытворчая праграма, якая выконваецца ў 1931 г. прамысловасьцю, перавысіць тое, што нямчалася для трэцяга году ў пяцігадовым пляне. Ужо цяпер можна з поўнай упэўненасьцю сьцьвярджаць, што ў бягучым годзе мы настолькі далёка пасунемся наперад у разьвіцьці індустрыі, што ў паступным, у 1932 годзе мы зможам поўнасьцю скончыць выкананьне пяцігадовага пляну.

Мы не сумняваемся, што 1932 год будзе годам завяршэньня пяцігодкі, г. зн. сканчэньня пяцігодкі за чатыры гады (бурныя аплёдысмэнты).

Нашы ворагі з буржуазнага лягеру пралічыліся. Шэфэр і яму падобныя лічылі магчымым ажыцьцяўленьне за пяцігадовы тэрмін нават трох чвэртак пяцігадовага пляну. У адваротным выпадку, яны не адважыліся-б у свой час «прарочыць» аб тым, што нават пры ажыцьцяўленьні трох чвэртак заданьня пяцігадовага пляну будзе забясьпечана перамога сацыялістычнага мэтаду ў Эўропе.

Што-ж мы маем па самой справе? Адказам на гэта пытаньне зьяўляецца той факт, што ўжо да цяперашняга часу, г. зн. толькі да канца трэцяга году пяцігодкі, мы ўжо, прыкладна, на тры чэцьверці пяцігодку ажыцьцявілі (аплёдысмэнты).

Але нам гэтага мала. Мы павінны забясьпечыць поўнае, і прытым паскоранае, выкананьне пяцігодкі. І таму мы ўсе павінны зьясьціся на тым, каб даць абавязацельства, пуп'ю ў будучым годзе мы дабіемся поўнага ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну, г. зн. на справе ажыцьцёвім нашу пяцігодку за чатыры гады (аплёдысмэнты).

З ажыцьцяўленьнем пяцігодкі ў сельскай гаспадарцы мы ў некаторых адносінах маем яшчэ большыя посьпехі.

Пяцігодка намячала да канца 1933 г. калектывізацыю 20 проц. сялянскіх гаспадарак. Між тым, ужо цяпер, да канца трэцяга году пяцігодкі, калектывізавана — галоўным чынам у сельска-гаспадарчых арцелях — звыш 60 проц. сялянскіх гаспадарак. У разгортваньні саўгаснага будаўніцтва мы таксама перавысілі заданьні пяцігодкі. Перабудова сельскай гаспадаркі на сацыялістычных падставах зрабіла зусім выключныя посьпехі за апошнія 2-3 гады. Усё гэта дае нам падставу сьцьвярджаць, што на працягу будучага году калектывізацыя сялянскіх гаспадарак у Савецкім Саюзе ў асноўным будзе скончана (аплёдысмэнты).

Так стаіць справа з вынікамі будаўніцтва сацыялізму на рашаючых вучастках гаспадаркі.

Асобнае месца ў нашай гаспадарчай рабоце займаюць пытаньні снабжэньня, пытаньні арганізацыі савецкага гандлю. Тут нашы посьпехі яшчэ зусім невыстарчальны. За паляпшэньне гэтай справы мы павінны цяпер узяцца з асаблівай настойлівасьцю.

Недахопы ў справе снабжэньня адчуваюцца зараз на кожным кроку. Складанасьць арганізацыі гэтай работы і невыстарчальнасьць адпаведных кадраў у партыі, пры вялікай засьмечанасьці чужымі, буржуазнымі элемэнтамі ўсяго гандлёвага і асабліва каапэрацыйнага апарату робяць галіну снабжэньня найбольш паражальным вучасткам нашай работы. Тым з большай рашучасьцю партыя паказвае цяпер на неабходнасьць хутчэйшага паляпшэньня справы снабжэньня і неабходнасьць узмоцненай барацьбы з элемэнтамі бюракратызму, а часамі і шкодніцтва, у дзяржаўна-каапэрацыйным гандлёвым апараце.

Справа арганізацыі гандлю зьвязана ня толькі з задачамі арганізацыі гандлёва-размеркавальнай сеткі непасрэдна ў горадзе і непасрэдна ў вёсцы, але і з устанаўленьнем цэлага ланцуга ўзаемазадносін паміж горадам і вёскай. Ужо адно гэта гаворыць аб складанасьці справы і, разам з тым аб вялізарным палітычным значэньні паляпшэньня нашай работы ў гэтай галіне.

Партыя паставіла зараз пытаньні снабжэньня ў разрад найбольш актуальных сваіх задач. Бальшавікі, ідучы на чале рабочых і працоўных вёскі, чавінны дабіцца ўжо ў бліжэйшы час рашучага аруху ў справе арганізацыі савецкага гандлю.

Матар'яльныя магчымасьці для хуткага паляпшэньня снабжэньня ў нас ёсьць. Гэтыя магчымасьці растуць з кожным днём.

У нашай краіне ня толькі шпарка разгортваецца цяжкая індустрыя, але і прамысловасьць, якая вырабляе прадметы масавага спажываньня. Асабліва значныя посьпехі ў разьвіцьці лёгкай прамысловасьці мы маем за апошні час. Пры гэтым ужо значна ўзьнята сама база гэтай прамысловасьці, што забясьпечвае нам далейшы шпаркі рост яе прадукцыі і паляпшэньне снабжэньня прамтаварамі.

Рост сацыялістычных элемэнтаў у вёсцы стварыў значна больш спрыяючыя ўмовы для снабжэньня рабочых сельска-гаспадарчымі прадуктамі. Цяпер, пры палучэньні ўзрастаючага ўздыму ў сельскай гаспадарцы, усьвядомленае справы аставак харчовых прадуктаў і паляпшэньне снабжэньня імі рабочых у значнай меры залежыць ад нас самых, ад паляпшэньня нашага апарату.

Настойлівая работа над паляпшэньнем дзяржаўна-каапэрацыйнага гандлёвага апарату, жорсткая барацьба з бюракратызмам і злоўгул з буржуазнымі тэндэнцыямі ў ім, прыцягненьне да самага актыўнага ўдзелу ва ўсёй гэтай справе шырокіх колаў рабочых і калгасьнікаў у вёсцы — усё гэта можа і павінна даць значнае паляпшэньне ў снабжэньні ўжо ў бліжэйшы час.

Разам з тым, нельга не паказаць на труднейшыя вучасткі гаспадарчага будаўніцтва ў галінах для народнай гаспадаркі галінах. Гэтыя вучасткі — вугаль, мэталь і транспарт.

Што гэта рашаючыя вучасткі сацыялістычнай гаспадаркі, аб гэтым сьведчыць уся гісторыя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Вакол барацьбы за вугаль, за мэталь, за транспарт мы і цяпер пачэтвіны згуртаваць максымум нашых сіл. З таго часу, як Кастрычніцкая рэвалюцыя ў асноўным вырашыла абожжавую праблему, т. зн. пытаньне аб абожжы, мы з яшчэ большай энэргіяй павінны змагацца за рашучую перамогу на фронце вугалю, мэталю і транспарту.

Партыя ўказала, як трэба падыйсьці да вырашэньня гэтых задач. Нашы задачы ў гэтай галіне, як і ў цэлым нашы задачы ў новых умовах работы прамысловасьці, даны ў тых указаньнях нашай партыі і яе Цэнтральнага Камітэту, якія шырока вядомы як «пісьмо указаньняў тав. Сталіна» (аплёдысмэнты).

У гэтых указаньнях даны важнейшыя практычныя дырэктывы для нашай гаспадарчай работы.

У іх указана, у чым заключаюцца нашы абавязкі па ажыцьцяўленьні такпатрэбнай цяпер арганізаванай вярбоўкі новых рабочых кадраў для прамысловасьці, як трэба забясьпечыць у палітыцы аплаты працы рабочых ліквідацыю дробна-буржуазнай ураўнілаўкі — гэтага шкаднейшага праяўленьня чужых рабочай кясе ўплываў у нашай гаспадарчай практыцы, і як трэба змагацца з недапушчальнай у вытворчасьці абязьлічкай у адносінах машын і мэханізмаў. Разам з тым, у гэтых указаньнях партыяй растлумачаны нашы цяперашнія задачы як у адносінах старых буржуазных і поўбуржуазных тэхнічных кадраў, так і ў адносінах падрыхтоўкі новых кадраў і, асабліва, новых тэхнічных кадраў з людзей рабочай кясы. Нарэшце, у гэтых указаньнях рашуча падкрэслена неабходнасьць бальшавіцкай барацьбы за павялічэньне пакаяленьняў у сацыялістычнай гаспадарцы і за правядзеньне ўстаноўленай партыяй і савецкай уладай палітыкі гаспадарчага разрахунку.

У справе ўмацаваньня сацыялістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы ў нас яшчэ непачаты край работы.

Партыя паставіла ў цэнтры ўвагі задачу арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы натыкаецца на супраціўленьне кулацтва, формы барацьбы якога з калгасамі ва многіх зьмяніліся, але сама барацьба далёка ня спынілася. Калі нават у саўгасным будаўніцтве нам прыходзіцца весьці барацьбу з праўленьнямі буржуазных тэндэнцый, са спробамі ігнараваць (абыходзіць) пільныя патрабаваньні і важнейшыя інтарэсы дзяржавы, дык у калгасах уплыў дробна буржуазных тэндэнцый яшчэ больш моцны, і таму кулак знаходзіць ня мала шляхоў для правядзеньня свайго ўплыву на тую ці іншую частку калгасьнікаў. Бальшавіцкае выхаваньне калгасных мас павінна зрабіць сваё выяўленьне ва ўсямерным арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і ў росьце сьвядомых адносін калгасьнікаў да выкананьня абавязацельстваў перад сацыялістычнай дзяржавай.

Сказанае ў асноўным вызначае нашы бягучыя задачы. Чым больш настойліва і пасьлядоўна мы будзем ажыцьцяўляць гэтыя задачы на практыцы, тым вышэй будуць бальшавіцкія тэмпы нашага будаўніцтва, тым вышэй узьнімецца прадукцыйнасьць працы ў нашай індустрыі і ў сельскай гаспадарцы, тым больш пераможна будзе прасоўвацца наперад справа сацыялізму.

Барацьба за перамогу сацыялізму ў нашай краіне зьяўляецца ня толькі справай рабочых самога Савецкага Саюзу. Яна зьяўляецца кроўнай справай усяго міжнароднага пралетарыяту.

Гэта барацьба зьвязана разам з тым з забесьпячэньнем мірных умоў нашага разьвіцьця, і, значыцца, яна непарыўна зьвязана з барацьбой за мір. Няма патрэбы даказваць, што барацьба за мір, якая пасьлядоўна праводзіцца СССР, таксама зьяўляецца выяўленьнем інтарэсаў усяго міжнароднага пралетарыяту, выяўленьнем інтарэсаў працоўных усіх краін.

3. Будаўніцтва сацыялізму і барацьба за мір

Сусьветны крызіс улёс значныя зьмены ў міжнародную абстаноўку. Усе супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы ў сілу крызісу яшчэ больш абастрыліся, пры гэтым усё больш нарастае абастрэньне міжнародных супярэчнасьцяй у лягеры імпэрыялізму. Гэта нямінуча ўжо таму, што эканамічны крызіс вядзе да значнага скарачэньня рынкаў збыту, а гэта ў сваю чаргу сутыкае ільбамі капіталістычныя краіны. Зразумела, гэта таксама вядзе да абастрэньня асноўнай сусьветнай супярэчнасьці—непрымірымай па сваёй прынцыповай аснове супярэчнасьці паміж лягерам імпэрыялізму і сацыялістычнай рэспублікай Саветаў. Праўда, за апошні час з боку кіраўнікоў буржуазных ураўрад робіцца ўсё больш і больш дэкларацыйных заяў аб мірных імкненьнях і прыязных пачуцьцях. Сталі больш частымі паездкі дыпляматаў і недыпляматаў са сталіцы ў сталіцу для тайных і паўсакрэтных перагавораў. Але міралюбівыя дэкларацыі буржуазных міністраў ніколі і ні ў якай меры не перашкаджалі і не перашкаджаюць імпэрыялістычным інтэрвэнцыям і акупацыям тэрыторый чужых дзяржаў з боку паасобных, больш падрыхтаваных для гэтага капіталістычных дзяржаў.

Сапраўдны сэнс пачэсных парад прадстаўнікоў буйнейшых імпэрыялістычных краін зусім ясны. У сусьветнай абстаноўцы, што зьмянілася, асабліва ў розультаце сусьветнага крызісу, які ўсё паглыбляецца, ня можа не адбывацца поўнай перагрупоўкі сіл у лягеры імпэрыялізму. Гэта выцякае з патрэбнасьці забясьпечыць больш шырокія і больш моцныя рынкі для збыту сваіх тавараў, для ўкладаньня сваіх капіталаў і імкненьня для агараджэньня калёніяльных і залежных краін ад праніканьня туды замежнага канкурэнта і інш. Усё гэта выклікае пэўную перабудову ў радах імпэрыялістаў, падпаўленьне або замену адных міжурадавых згод і блёкаў другімі, узмоцненае падшуканьне новых саюзьнікаў, новыя і новыя спробы перакладваньня вынікаў крызісу на другія плечы, асабліва на плечы слабейшых дзяржаў, калёній і паўкалёній.

Няма ўжо чаго гаварыць аб тым, што пры ўсіх тых, прынамсі, буйных міжнародных разьніках буржуазная дыпляматыя павінна цяпер значна больш лічыцца з узрастаючай удзельнай вагой сацыялістычнай рэспублікі Саветаў. У гэтых разьніках ня могуць такэма не адыгрываць значнай ролі спробы імпэрыялістаў у тэй ці іншай меры затрымаць посьпехі нашага будаўніцтва і пановаму павесьці падрыхтоўку простага нападу на Савецкі Саюз. Нельга забываць аб тым, што ў канчатковым выніку імпэрыялістычныя дзяржавы вырашаюць свае карэнныя пытаньні толькі ў прострадзі узброенай барацьбе.

Сусьветны эканамічны крызіс абвастрае праблему барацьбы за новы перадзел сьвету і таму небясьпека новых імпэрыялістычных войнаў цяпер узрастае з вялікай шпаркасьцю. Усё больш павялічваецца няўстойлівасьць у разьвіцьці капіталістычных краін. Выклікане крызісам абвастрэньне ўсіх супярэчнасьцяй капіталізму, асабліва ў сувязі з вялізарнай пяроўнамернасьцю разьвіцьця капіталістычных дзяржаў, узмоцнена разхістванае асновы пасьляваенных міжнародных адносін, якія (асновы) яшчэ ўчора здаваліся многім устойлівымі. Такавы, напрыклад, стаўшчына, якое стварылася для правядзеньня версальскіх згод.

Не ўпяршыню ідзе вазьня вакол пытаньняў аб пераглядзе версальскага дагавору. Цяпер справы Версалю трацяць асабліва моцна. Ні аб якай устойлівасьці ў гэтых адносінах ужо ніхто не гаворыць. А між тым Версаль быў асновай міжнародных узаемаадносін у пасьляваенный Эўропе, дый ня толькі ў Эўропе.

Варта яшчэ спыніцца на пазоўных важнейшых падзеях міжнароднага жыцьця. Так, буйнейшая імпэрыялістычная дзяржава — Вялікабрытанія — перажывае ў сувязі з крызісам яе малыя затрудненьні. Не гаворачы ўжо аб палітычнай перагрупоўцы, якая адбываецца там, нельга прайсьці міма таго факту, што ангельская буржуазія істэрвала сваім фунтам. Адмак, адмаўленьне ад цьвёрдага курсу фунта стэрлінгаў адбылося, ва ўсякім выпадку, не таму, што пазыцыі ангельскай буржуазіі за апошні час узмацніліся. Паданьне фунта адбіває значнае ўзмацненьне хістаньняў «глебы, на якой трымаецца імпэрыялістычная магутнасьць гэтай краіны. Але палегчыўшы сабе справу новага грабежніцтва працоўных (зьніжэньне зарплаты рабочых і інш.) і, паставіўшы на пэўны час свой замежны гандаль у больш спрыяючыя ўмовы канкурэнцыі, капіталістычная Англія зусім яшчэ ня выйшла з затрудненьняў. Наадварот, падзьнне фунта нямінуча вядзе да абастрэньня ўнутраных супярэчнасьцяй і да абастрэньня адносін на арэне міжнародный імпэрыялістычнай барацьбы.

Становішча ў другой магутнейшай капіталістычнай краіне—у ПАЗШ—таксама сьведчыць аб буйнейшых зьменах у капіталістычным лягеры. Учора яшчэ ПАЗШ ганарыліся сваім росквітам «праспэрыці». Гэтым «праспэрыці» карысталася і некаторая група рабочай арыстакратыі. Але вось ужо два з лішкам гады, як ПАЗШ няўхільна коцяцца з гары. Ад «праспэрыці» не засталося і сьледу. Нельга сказаць, каб такое разьвіцьцё падзей мало спрыяць умацаваньню пазыцый капіталізму ў Амэрыц

Кастрычніцкая рэвалюцыя і барацьба за сацыялізм

(Даклад тав. В. МОЛАТАВА на ўрачыстым сходзе Маскоўскага савету, прысьвечаным XIV гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі—6 лістапада)

(ПРАЦЯГ)

Савецкі Саюз разам з тым ня ўтойваў і ня будзе таіць сваіх адносін да кітайскага народу, да яго барацьбы за вызваленьне ад імпэрыялістычнага ўціску, да яго барацьбы за дзяржаўную незалежнасьць і тэрыторыяльнае аб'яднаньне. У гэтых адносінах праўрыны нашай краіны ўсёй душой на баку кітайскага народу.

Падзеі ў Кітаі паказваюць, што імпэрыялістычныя дзяржавы праводзяць цяпер падзел Кітаю. Пры гэтым яны апіраюцца яна—на адну генэральскую зграю, другая—на другую генэральскую зграю ў Кітаі. Палітыку падзелу Кітаю яны бесперашка прыфарбоўваюць і ўрачыста абвяшчаюць разважальнымі абітымі, што «Кітай зусім не краіна, а канцэпцыя» (словы французкай імпэрыялістычнай клікі «Лібэрэ»). На падставе гэтага імпэрыялісты абвяшчаюць свабоду гвалтаваньня імпэрыялістычных сіл у Кітаі, асабліва пры гэтым клапоцяцца аб стварэньні далёкаўсходняга плацдарму супроць СССР.

Факты апошніх год у выстарчальнай меры пацвердзілі нязгодлівасьць Гаміндану да барацьбы з імпэрыялізмам. На справе пасобныя гаміндаўскія зграі зьяўляюцца ў гэй ці іншай меры агентурай замежных імпэрыялістычных сіл. Усё, што было дэмакратычнага ў Гаміндане, выпала адтуль. Гаміндан ужо ў поўнай меры выявіў, што барацьба, якая адбываецца ўнутры яго, прадстаўляе сабой барацьбу пасобных генэральска-памешчыцкіх і генэральска-буржуазных зграй а гэтыя зграі эксплёататараў утрымліваюць уладу толькі дзякуючы таму, што апіраюцца на падтрыманьне тэй ці іншай імпэрыялістычнай дзяржавы, а часамі і цэлай групы імпэрыялістычных дзяржаў.

Народныя масы Кітаю і перш за ўсё кітайскі пралетарыят робяць з гэтага свае вывады. Яны бачаць, што шлях Гаміндану—ня шлях паляпшэньня ўмоў жыцьця працоўных, ня шлях нацыянальнага адраджэньня Кітаю. Зразумела, што кітайскі народ, рабочыя і сяляне Кітаю шукаюць сваёй дарогі. Зразумела, што ў іх вачох узрастае аўтарытэт краіны Саветаў. І з кожным днём для іх павінна станавіцца ўсё ясьней і ясьней, што толькі наш шлях, шлях барацьбы рускіх рабочых і сялян, дае сапраўдны выхад да паляпшэньня жыцьця і нацыянальнага адраджэньня Кітаю.

Саветы, як органы рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры рабочых і сялян, існуюць ужо ня першы год у Кітаі. Яны маюць сваю вялікую будучыню. Толькі яны зьяўляюцца сапраўднымі арганамі барацьбы з генэраламі, памешчыкамі, кампрадорамі, з усёй кітайскай буржуазіяй—барацьбы за паляпшэньне жыцьця народных мас. Толькі яны здольны давесьці да канца і забясьпечыць посьпех у барацьбе за вызваленьне Кітаю ад імпэрыялізму, за яго незалежнасьць і нацыянальнае аб'яднаньне. Толькі Саветы на чале з рабочай клясай забясьпечаць нерамогу кітайскаму народу. (Аплёдысмэнты).

З усяго гэтага мы робім свой вывад у адносінах замежнай палітыкі Савецкага Саюзу.

Нашая задачай у галіне замежнай палітыкі мы лічым далейшае правядзеньне пасьлядоўнай барацьбы за мір, няўхільнае выкрыцьцё ўсіх прапакацый новых войнаў і спроб арганізацыі нападу на СССР і разам з тым усямернае ўмацаваньне абароназдольнасьці нашай краіны і ўзьяднаньне на належную вышыню слаўнай Чырвонай армії (аплёдысмэнты).

Гэтай дарогай мы ішлі да гэтага часу і атрымалі ўжо не адну перамогу. Ідучы і далей гэтай выпрабаванай дарогай, мы, ня гледзячы на ўсе труднасьці, дабіемся новых і пры тым рашаючых для справы сацыялізму перамог (аплёдысмэнты).

4. „Сакрэты" перамог бальшавізму

Заданка паказаць пытаньне, на чым заснаваны посьпехі бальшавізму?

Па-свойму адказаў на гэта пытаньне Бернард Шоў у нядаўнім артыкуле. Паводле яго слоў «камуністычныя правадыры таксама добра разумеюць камунізм, як і капіталізм. Капіталістычныя дамагогі не разумеюць ні капіталізму, ні камунізму».

У гэтых словах Шоў ёсьць бясспрэчны сэнс. Навука марксізму-ленінізму была основай галоўнай навукай для бальшавікоў. Ленінізм-марксізм нашай эпохі грунтуецца вучыў нас таму, што такое капіталізм і як яго трэба скідаць. Ленінізм вучыў нас таксама таму, што такое сацыялізм і як яго трэба будаваць. Нашы посьпехі ва ўсьведамленьні ленінскага вучэньня не прайшлі марна. Нашы перамогі, перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, сталі магчымымі толькі таму, што мы былі і застаемся правадыркамі ленінізму (аплёдысмэнты).

Але быць правадыркам ленінізму азначае—весьці непрымірымую барацьбу з апартунізмам. Быць правадыркам ленінізму, значыць—весьці барацьбу за ленінізм, супроць усіх і ўсякіх рознавіднасьцей апартунізму. Без непрымірымай барацьбы з апартунізмам, які зьяўляецца нічым іншым, як праяўленьнем буржуазных уплываў на тыя ці іншыя праслойкі рабочых—у нас не мала-б быць перамог, атрыманых Кастрычніцкай рэвалюцыяй.

Наша барацьба за ленінізм была накіравана супроць двух асноўных апартуністычных скажэньняў. У барацьбе з трацкісцкай «лявай» буржуазна-мяшчанскага тыпу—з аднаго боку, і з буржуазна-кулацкай ідэалёгіяй правага ўхілу—з другога, выкоўваліся рады нашай бальшавіцкай партыі, якая стаяла і стаіць на чале пераможнай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Значэньне гэтай барацьбы ленінскай партыі, барацьбы на два фронты досыць растлумачана. Зараз можа быць гаворка толькі аб асноўных вынніках гэтай барацьбы, асабліва ў сувязі з нашымі далейшымі задачамі.

Гэтыя вынікі ня могуць нас ня цікавіць як з пункту погляду непасрэдных інтарэсаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва, так і з пункту погляду барацьбы за канчатковую перамогу сацыялізму ва ўсім сьвеце.

З пункту погляду нашых унутраных задач, барацьбы з правымі і з трацкістамі мае і цяпер актуальнейшае значэньне.

Відома, што мы атрымалі рашаючую перамогу над правай апазыцыяй толькі пасьля таго, як наша наступленьне на кулака і арганізацыя для барацьбы з кулацтвам бяднацка-серадняцкіх мас закончыліся посьпехам. Правыя капітулявалі пасьля таго, калі серадняцкая масе вёскі павярнула на шлях сацыяльнай калектывізацыі і калі бяднацка-серадняцкія масы пад кіраўніцтвам нашай партыі перайшлі на практыцы да зжыцьця цяўленьня палітыкі ліквідацыі кулацтва як класы.

Але навіна чаго даказваць, што ўчарашныя адноасобнікі-сяляне не зьяўляюцца ў масе сваёй ужо сёньня сацыялістамі, што яны далёка яшчэ ня вызваліліся ад многіх дробна-буржуазных забабонаў і дробна-ўласьніцкіх звычак. А гэта навіне немалую гібель для барацьбы кулака за ўплыў на масы. Таму барацьба ня спробамі кулака чапляцца за свой уплыў на некаторыя праслойкі працоўных вёскі мае зараз важнейшае значэньне. Без такой барацьбы ня можа адбывацца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, ня можа адбывацца такі необходны для нас ўздым прадукцыйнасьці працы ня толькі ў калгасах, але і ў саўгасах, і, значыцца, ня могуць пераматаць сацыялістычныя формы гаспадаркі.

Правыя апартуністычныя ацыпь у партыі разьбіта і ня існуе як асобны, самастойная сіла. Але правыя апартуністычныя элементы ў практыцы нашых арганізацый далёка ня зжыты і даюць сябе адчуваць на кожным кроку. Яны даюць сябе адчуваць і ў найбольш адкрытай форме—у выглядзе патаканьня кулацтву, а таксама ў выглядзе бездапамажнасьці некаторых работнікаў у справе барацьбы з буржуазнымі тэндэнцыямі ў калгасах і саўгасах. Правыя апартуністычныя тэндэнцыі даюць сябе адчуваць яшчэ ня рэдка і пры тым усюды, дзе ідзе барацьба за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і дзе ўплыў чужых клясавых элементаў у нашым апараце адбіваецца на тых ці іншых праслойках бальшавіцкай партыі і праяўляецца ў тых ці іншых формах апартуністычнага супраціўленьня ажыцьцяўленьню правазгімых партыяй тэмпаў.

Але і барацьба з трацкізмам ня спыніла сваёго вялікага палітычнага значэньня.

Праўда, трацкізм у яго адкрытым выяўленьні ўжо поўнасьцю выродзіўся ў контр-рэвалюцыйную палітычную групоўку. За «левымі» фразамі трацкістаў цяпер ужо любы сярэдні рабочы пакажа меншавіцкае, антысавецкае нутро. Але з атрымкамі трацкізму даводзіцца сустракацца. Без пастаяннай барацьбы з апартуністычнымі скажэньнямі трацкісцкага тыпу мы і цяпер ня можам абыйсьціся.

Сэрцавіна трацкізму было адмаўленьне магчымасьці перамогі сацыялізму ў нашай краіне. Але гэта нівер'е ў справу сацыялізму зьяўляецца, урэшце, самай характэрнай рысай усякага апартунізму, усякай дробна-буржуазнай плыні. Трацкізм толькі найбольш яркая форма гэтага буржуазнага нівер'я ў перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялізму.

З гэтым нівер'ем была непарыўна зьвязана паніка перад труднасьцямі кля сваёй барацьбы і, у прыватнасьці, паніка перад наступленьнем кулацтва. Гэтай паніцы перад клясавым ворагам пралетарыяту адпавядала і тактыка трацкістаў.

Гэта тактыка выцякала з таго трацкісцкага становішча, што серадняк ня можа быць моцным саюзьнікам рабочае клясы ў барацьбе за сацыялізм. І таму трацкісцкая тактыка азначала на справе сьціраньне прынцыповай розьніцы паміж нашымі адносінамі да кулака і да серадняка і на справе вяла да пашырэньня на серадняка тэй-жа тактыкі, якую мы ўжывалі ў барацьбе з кулацтвам. Зразумела, што гэта палітычная лінія ня мае нічога агульнага з ленінізмам і наскрозь яму варожая.

Але і ў новых умовах, ва ўмовах пераходу да суцэльнай калектывізацыі, мы ўжо мелі справу з намыркамі трацкісцкага тыпу ў вёсцы. Даволі спасылацца на ператы мінулага году.

З другога боку, і ў далейшым нельга ня лічыцца з магчымасьцю апартуністычных скажэньняў трацкісцкага тыпу.

У нас калектывізавана звыш 60 проц. сялянскіх гаспадарак. Але гэта, з другога боку, азначае, што засталося яшчэ каля 40 проц. аднаасобных гаспадарак. Пытаньне аб адносінах да тых, што засталіся аднаасобнікамі, мае вялікае палітычнае значэньне.

Ня гледзячы на тое, што толькі меншая частка сялян знаходзіцца зараз на за калтасамі, пытаньне аб заваяваньні на наш бок масы, што засталася аднаасобнікамі, ня зьнята з парадку дня. Мэтады зацаду і гвалту і цяпер настолькі-ж нецярпімы ў адносінах працоўных сялян, як яны былі нецярпімы і раней. Наша задача — весьці барацьбу за заваяваньне на бок калектывізацыі ўсёй масы працоўных сялян. Але гэту справу мы можам па-бальшавіцку выканаць толькі ў тым выпадку, калі будзем весьці настойлівую і цярплівую растлумачальную работу ў масах аднаасобнікаў і асабліва, калі на справе здолеем усё лепш даказваць перавагі работы ў калгасе. Толькі посьпехамі ў справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і, значыцца, у справе сапраўднага павышэньня прадукцыйнасьці працы калгасьнікаў мы забясьпечым поўную і канчатковую перамогу калектывізацыі.

Для таго, каб забясьпечыць правядзеньне іменна гэтых мэтадаў работы ў масах, неабходна далейшая барацьба з трацкісцкімі вывіхамі, адкуль-бы ня ішлі і ў якія-б формы не выліваліся гэтыя апартуністычныя скажэньні.

Нарэшце, два словы аб значэньні на шай барацьбы з апартунізмам з пункту погляду нашых міжнародных задач.

Як паказала ўся 14-гадовая гісторыя Кастрычніцкай рэвалюцыі, бальшавікі цалкам мелі рацыю ў барацьбе з трацкізмам, які адмаўляў магчымасьць перамогі сацыялізму ў адной краіне. Цяпер даказана жывымі фактамі, што перамога сацыялізму ў нашай краіне ня толькі ажыцьцёўлена, але і поўнасьцю забясьпечана.

Выключнае міжнароднае значэньне гэтай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі заключаецца ў тым, што ленінскае тварытычнае палажэньне аб магчымасьці перамогі сацыялізму ў адной краіне ператварыліся ў жывую праўдасьць, выклікаючы жывёльны трэпет у радох нашых ворагаў, усяляючы бадзёрую ўпэўненасьць у канчатковую перамогу сацыялізму ў рабочай клясе ўсяго сьвету (аплёдысмэнты).

І так, ленінізм перамагае. На аснове ленінізму ідзе згуртаваньне радоў рабочае клясы, а вакол яе — і ўсёй масы працоўных гораду і вёскі. У гэтым — «сакрэт» перамог сацыялізму.

Наколькі вялікія посьпехі ленінізму ў нашай краіне, можна лепш за ўсё меркаваць па адносінах шырокіх мас працоўных да справы будаўніцтва сацыялізму на практыцы. Самым паказальным зьяўляецца рост сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Сацыялістычнае спаборніцтва ператварылася ўжо ў найшырэйшы рух у рабочых масах і цяпер пашыраецца ў гматмільённай армії калгасьнікаў. Гэта азначае, што барацьба за перамогу сацыялізму, якая знаходзіць зараз сваё найбольш яркае выяўленьне ў падняцьці прадукцыйнасьці працы на фабрыках і заводах, у капальнях і на чыгунках, у саўгасах і калгасах — што гэта барацьба стала сьвядомай справай мільёнаў рабочых і працоўных вёскі.

Бальшавіцкая партыя ідзе на чале будаўніцтва сацыялізму. Але гады актыўных змагароў за сацыялізм далёка не абмяжоўваюцца партыйнымі рамкамі. У шырокіх масах беспартыйных рабочых і работніц ёсьць ужо не адна сотня тысяч сапраўды актыўных і самаадданых змагароў за сацыялізм.

У нас ужо некалькі мільёнаў ударнікаў і ўдарніц у прамысловасьці. Большая іх частка — беспартыйныя пралетары і пралетаркі. Гэта значыць, што барацьба за сацыялізм, барацьба за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы ў сацыялістычнай індустрыі зрабілася пасапраўднаму справай мільённых мас. І ў гэтым — сапраўдная зарука перамогі нашай справы.

Паколькі мы ўжо забясьпечылі бясспрэчнае пашаваньне сацыялістычных форм гаспадаркі ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы, і паколькі гэта перамога зьяўляецца самым пераканаўчым падмуркаваньнем правільнасьці палітыкі нашай ленінскай партыі, — пастолькі рашаючае ў далейшых посьпехах сацыялізму залежыць ад нас саміх, ад нашай здольнасьці да арганізацыі мас, ад нашага зменьшэньня высунуць для гэтага патрэбныя кадры кіраўнікоў і забясьпечыць яшчэ большае вылучэньне гэтых кадраў у далейшым. Тым больш, што за тады рэвалюцыі вырасла новае пакаленьне — пакаленьне моладзі і асабліва камсамольцаў з рэвалюцыйнай закваскай.

Задачы падбору кіруючых кадраў сацыялістычнага будаўніцтва і вылучэньня ў рады кіраўнікоў новых і новых перадавікоў-будаўнікоў з масы рабочых і сялян-калгасьнікаў — і асобна з моладзі — павінны стаяць у радзе нашых цэнтральных задач. На гэта трэба ўказаць тым больш, што нам яшчэ прыдзецца ня раз мець справу з контр-рэвалюцыйнымі шкодзікамі ў дзяржапараце і весьці ўпартую і працяжную барацьбу з бюракратызмам, гнілой коснасьцю і да таго падобнымі балячкамі ва многіх нашых органах.

Ўзьняцьце культурнага ўзроўню мае будзе ў гэтых адносінах адыгрываць першачарговае значэньне. З гэтай справай зьвязана таксама ажыцьцяўленьне задачы аўладаньня тэхнікай і ўсёй сутнасьцю вытворчасьці і кіраўніцтва з боку нашых узрастаючых кадраў.

З усяго сказанага відаць, што посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва — гэта посьпехі пралетарыяту, які эмацэцца за сваю справу пад сьцягам марксізму-ленінізму. Без бальшавіцкага правядзеньня ў жыцьцё асноў ленінскага вучэньня мы ня мелі-б таго, што ператворана ў жыцьцё 14-гадовай гісторыяй Кастрычніцкай рэвалюцыі.

З гэтага мы робім свой вывад:

Пасьлядоўная барацьба за ленінізм і непрымірымасьць у адносінах да апартунізму ва ўсіх яго рознавіднасьцях — асноўная ўмова перамогі сацыялізму.

***

Такі асноўны вывад з 14-гадовай гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У выніку, рашаючая тэндэнцыя ў разьвіцьці сусьветных грамадзкіх сіл, у адносінах сіл сацыялізму і капіталізму, ідзе ў наш бок, складваецца ў карысьць нашай справы.

Бясспрэчна, што новы грамадзкі ладлад сацыялізму, адваёўвае для сябе ўсё больш моцныя пазыцыі, а гэта ня можа не адбывацца за кошт удзельнай вагі капіталізму.

Значэньне пройдзенага шляху нам зараз немагчыма ацаніць поўнасьцю, але ва ўсякім разе заваяванага ўжо ніхто ня зможа вырваць з нашых рук.

Савецкая ўлада прайшла праз труднейшыя этапы. Галоўныя ўнутраныя труднасьці намі ўжо пройдзены.

Няма і ня можа быць такой сілы, якая-б цяпер змагла рабочую клясу Савецкага Саюзу вярнуць да старога жыцьця, да падняволенай працы пад камандай капіталу. Няма і ня можа быць такой сілы, якая-б змагла наша сялянства і асабліва нашых калгасьнікаў, якія напрабавалі на вопыце мільёнаў першы ваг калгаснай працы і атрымалі ўжо ў сваёй працы вялізарнае палягчэньне ад ужываньня трактараў і новых сельгасмашын, — вярнуць да старога жыцьця, пад ярмо памешчыка, пад палку куркуля і земскага начальніка. Няма і ня можа знайсьціся такой сілы, якая была-б здольна вярнуць назад нашых рабочых і сялян, мільённыя масы якіх ня толькі пешавідаюць усёй душой палажэньне цара, памешчыкаў і капіталістаў, але і ведаюць верны шлях да свайго вызваленьня (аплёдысмэнты).

У чым-жа заключаецца цяпер асноваасноў нашай канчатковай перамогі?

Яна заключаецца, перш і раней за ўсё — ва ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы, ва ўздыме нашай сацыялістычнай гаспадаркі.

Так іменна вызначыў асноўныя ўмовы перамогі сацыялізму наш вялікі правадыр. Ленін гаварыў:

«Прадукцыйнасьць працы, гэта ў апошнім разрахунку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу. Капіталізм стварыў прадукцыйнасьць працы, нячуваную пры прыгоньніцтве. Капіталізм можа быць канчаткова пераможан і будзе канчаткова пераможан тым, што сацыялізм створыць новую, значна больш высокую прадукцыйнасьць працы. Гэта — справа вельмі цяжкая і вельмі доўгая, але яна пачата, вось у чым самае галоўнае». (Ленін. «Великий почин», том XVI, стар. 254).

Значэньне пытаньня аб прадукцыйнасьці працы Ленін падкрэсьліў, далей, у наступных словах:

«Камунізм ёсьць вышэйшая, супроць капіталістычнай, прадукцыйнасьць працы добраахвотных, сьвядомых, аб'яднаных, выкарыстоўваючых перадавую тэхніку, рабочых». (Там-жа, стар. 255).

Падаючы мною словы Леніна адносяцца да таго перыяду, калі па ініцыятыве рабочых стала разгортвацца арганізацыя суботнікаў. Суботнікі былі зараджэньнем новых, сапраўды сацыялістычных элементаў у нашай прамысловасьці і на транспарце. Ленін адразу-ж адзначыў гістарычнае значэньне суботнікаў для развіцьця камуністычных форм працы ў нашай краіне.

З таго часу сацыялістычная рэвалюцыя зрабіла гігантскія посьпехі. Гэтыя посьпехі знайшлі сваё дасканалае выяўленьне ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве. Прычым пралетарскі рух ударніцтва ўжо захапіў мільёны працоўных. Сьледам за рабочымі ўдарны рух расьце і спрод калгасьнікаў. Гэта азначае, што справа сацыялізму заваёўвае для сябе ўсё больш моцную матар'яльную аснову. І гэтай асновай зьяўляецца — ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы ў нашай сацыялістычнай гаспадарцы.

Наша рэспубліка падобна на завод. Ці-ж у нас мала такіх заводаў-гігантаў, якія даюць вялізарную прадукцыю і адначасова з гэтым праводзяць поўную рэканструкцыю сваіх цэхаў і прадпрыемстваў у цэлым. Такіх заводаў у нас ня мала. Посьпехі нашага будаўніцтва заснаваны, між іншым, іменна на тым, што такія заводы ўмеюць цьвёрда праводзіць генэральную лінію рэканструкцыі сваёй вытворчасьці і разам з тым весьці пасьпяховую барацьбу за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы ў сваіх цэхах, майстэрнях, брыгадах і пасобных агрэгатах. На такі завод падобна цяпер наша рэспубліка Саветаў.

У нашай краіне пануючае становішча ўжо займаюць сацыялістычныя элементы. Ад работы нашых прамысловых прадпрыемстваў, чыгунак, саўгасаў і калгасаў залежыць цяпер усё асноўнае. Іх недахопы, і асабліва слабасьці ў прадукцыйнасьці працы, — цяжкія ўдары па нашым будаўніцтве. Іх посьпехі ва ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы—лепшы перамогі сацыялізму.

Узьняцьце прадукцыйнасьці працы на фабрыках і на заводах, у капальнях і на промыслах, на чыгунках і ў водным транспарце, у саўгасах усіх відаў і ў шматлюдных радох калгасаў — вось у чым для нас, урэшце, задача задач.

Сканцэнтруем на гэтым максімум нашых намаганьняў. Сканцэнтруем на гэтым намаганьні нашых гаспадарчых кіраўнікоў, нашых работнікаў навукі і тэхнікі — сканцэнтруем на гэтым максімум намаганьняў усіх нашых арганізацый. Па-бальшавіцку разгорнем барацьбу за зьнішчэньне ў нашым апараце ўсіх і ўсялякіх бюракратычных перажкод на шляху рашучага палягчэньня справы. А галоўнае — згуртуем на аснове барацьбы за гэту справу шырокія масы рабочых і сялян — калгасьнікаў пад кіраўніцтвам нашай партыі.

Посьпехі ў справе ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы — лепшы, несакрушальны і сапраўды трапны аргумэнт справы сацыялізму.

Нашы посьпехі ў гэтай справе маюць рашаючае значэньне ня толькі з пункту погляду ўнутраных, але і з пункту погляду міжнародных задач барацьбы за сацыялізм. Іменна тут, на вырашэньні задач узьняцьця прадукцыйнасьці працы ў сацыялістычнай гаспадарцы, перш за ўсё даецца практычны адказ на пытаньне аб канчатковай перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі, на пытаньне аб перамозе справы камунізму.

Гэта — мірны вучастак барацьбы за сацыялізм. Але ён будзе мець рашаючае значэньне і ў момант нападу імпэрыялістычных сіл на СССР, у момант разьвязкі барацьбы паміж сацыялізмам і капіталізмам.

З ростам ліку нашых заводаў, фабрык, саўгасаў і калгасаў пытаньне аб узьняцьці прадукцыйнасьці працы набывае ўсё большае значэньне. А цяпер кожны дзень павялічвае лік ня толькі сярэдніх заводаў, але і заводаў-гігантаў.

Да двух трактарных заводаў — у Ленінградзе і Сталінградзе, далучыўся новы трактарны завод у сталіцы Украіны. Увайшоў у строй магутны аўтамабільны завод у Маскве і набліжаецца дзень пуску аўтамабільнага гіганта ў Нізкім Ноўгарадзе. Ужо пусканцца ў ход Магнітабуд на Урале і Кузьнецкбуд у Сібіры. На чарзе пуск гігантаў хэмічнай прамысловасьці ў Бераэьніках, а потым і ў Бобрыках. На чарзе, далей, пуск Дняпрабуду, а таксама і Дняпракамбінату. Немагчыма пералічыць усе, нават толькі буйнейшыя нашы будаўніцтвы і хаця-б толькі ў адной індустрыі.

Між тым, пуск кожнага новага заводу ў нашай краіне мае ня толькі значэньне новага заваяваньня ў нашым будаўніцтве, але мае вялізарнае міжнароднае значэньне ў барацьбе за справу сацыялізму. Кожны новы завод у нашай краіне — апорны пункт міжнароднага пралетарыяту. Таму ў нашым мірным будаўніцтве імпэрыялізм бачыць для сябе сьмяротную пагрозу. Нема тых злачынстваў, на якія-б ён не зладзіўся для падрыву ўзрастаючай магутнасьці сацыялізму ў СССР.

Усё гэта азначае, што пануючыя за межамі СССР імпэрыялістычныя сілы рана ці позна напрабуюць арганізаваць просты ўзброены напад на рэспубліку Саветаў. Мы павінны лічыцца ня толькі з імкнучасьцю новых імпэрыялістычных войнаў, але і з імкнучасьцю новых правакацый ваенных інтэрвэнцый супроць СССР. Мы ня будзем бальшавікамі, калі забудзем шматлікія указаньні Леніна аб тым, што новыя спробы разгрому савецкай рэспублікі з боку імпэрыялізму нямінучы. Нельга траціць ні аднаго дня ў падрыхтоўцы да адпору гэтым нападам.

Краіна Саветаў, якая верна сваёй палітыцы міру, якая пасьлядоўна змагаецца за ўмацаваньне мірных адносін з іншымі дзяржавамі, ні на кога ня зьбіраецца і ня зьбіраецца нападаць. Але, ідучыся з магчымасьцю ваенных інтэрвэнцый супроць СССР з боку нашых непрымірымых ворагаў з лягеру імпэрыялізму, мы з непахісная упэўненасьцю ў нашы сілы і ў сілы нашых прыяцеляў па клясе залуўлям: Савецкі Саюз ня толькі не бесабаронны, Савецкі Саюз непераможны (аплёдысмэнты).

Суадносіны ў разьвіцьці сусьветных сіл усё больш зьмяняюцца ў нашу карысьць. Але капіталізм ня зьбіраецца адмаўляцца ад барацьбы. Гэта акрасьлівае нашы задачы на самым трудным вучастку барацьбы за сацыялізм — на арэне ўзаемадносін сацыялізму з капіталістычным акружэньнем.

Буйнейшы баі тут яшчэ наперадзе. Але мы яшчэ пагледзім, як складуцца справы ў гэтых баёх для старога, спрахнелага, сніючага на корані капіталізму.

Справа барацьбы за сацыялізм зьвязана яшчэ з вялізарнымі труднасьцямі. Але мы ўпэўнены ў тым, што з яшчэ большымі і сапраўды непераможнымі труднасьцямі зьвязана справа барацьбы капіталізму за сваё далейшае існаваньне.

У рашаючых баёх прагрэсіўныя капіталістычныя падпоры ня толькі захіталіцца, Трэснуўшы фундамант капіталізму ня толькі стане разваліцца. Капіталістычны сьвет у гэтай сутычцы сіл затрашчыць ва ўсіх сваіх часьцях. І мы цьвёрда ўпэўнены ў тым, што гэта барацьба прыводзе да калчаткозай перамогі справы міжнароднага пралетарыяту.

Пройдзены шлях сьведчыць аб тым, што справа Кастрычніцкай рэвалюцыі ідзе да поўнай перамогі.

Нехай жыве Кастрычніцкая рэвалюцыя! Нехай жыве перамога камунізму! (Аплёдысмэнты. Аркестр грае «Інтэрнацыянал»).

МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ БССР

ЯШЧЭ НЯ УКЛЮЧЫЛАСЯ ПА-БАЯВОМУ У ФІНЭСТАФЭТУ

План мабілізацыі сродкаў-насельніцтва па лініі спажывецкай каапэрацыі займае вельмі значны процант у агульным фінансавым пляне БССР. Ад поўнага выкананьня гадавога пляну мабілізацыі сродкаў па спажывецкай каапэрацыі ў значнай ступені залежыць выкананьне фінпляну.

Між тым гэты вучастак зьяўляецца адным з самых слабых у рабоце спажывецкай каапэрацыі. Так, калі гарады (ЦРК і ЗРК) выканалі свой гадавы фінплян на 1 лістапада на 92,3 проц., дык вёска—большая частка райсаюзаў—правальвае выкананьне пляну. Справа мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў большасьці райсаюзаў і сельпо прадстаўлена самацёку. Райсаюзы і сельспажыўтаварыствы да гэтага часу не ўсьвядомілі вялізарнага значэньня мабілізацыі сродкаў, асабліва ў сувязі з пераходам спажывецкай каапэрацыі на работу выключна сваімі ўласнымі сродкамі.

Райсаюзы павінны ведаць, што тыя сельспажтаварыствы, якія поўнасьцю ня выканаюць свайго гадавога пляну мабілізацыі сродкаў, не атрымаюць ніякай фінансавай дапамогі з боку Белкаапсаюзу.

Паколькі дрэнна мабілізуюцца сродкі па спажывецкай сыстэме сьведчаць наступныя факты. БАБРУЙСКІ райсаюз атрымлівае весткі аб ходзе каапэраваньня і мабілізацыі сродкаў толькі ад 60 проц. сваіх сельспажтаварыстваў. Што робіцца ў рэшце сельспажтаварыстваў, райсаюз ня ведае.

Прыклад абсалютнай бязьдзейнасьці паказвае ЦЕРАХАЎСКІ райсаюз, які яднае 24 сельспажтаварыствы. ЛЕНІНСКАЕ сельспажтаварыства за ўвесь час свайго існаваньня здолела ўцягнуць у члены каапэрацыі толькі 4 чалавек. ХАРАШЭЎСКАЕ сельспажтаварыства—9 чал., ГЛЫБОЦКАЕ—9 і г. д.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што рад райсаюзаў і сельспажтаварыстваў па-баявому яшчэ ня ўключыліся ва ўсебеларускую фінэстафэту.

Райсаюзы павінны безадкладна, пры дапамозе партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый намагчы свае сілы для поўнага выкананьня гадавога пляну каапэраваньня і мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

КРЫЛАВІЦКІ.

БССР адстае ад Заходняй Вобласьці ў выкананьні фінпляну

Паміж БССР і Заходняй вобласьцю заключан дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў.

Даныя Наркамфіну БССР сьведчаць, што Заходняя вобласьць па ўсіх відах плацяжоў значна перагнала БССР

Кастрычніцкі плян па БССР выкананы на 74 проц., па Заходняй вобласьці на 85 проц.

Па пасобных плацяжох БССР адстае яшчэ больш. Так, у той час калі Заходняя вобласьць выканала плян па с.-г. падатку на 107 проц., дык БССР выканала толькі на 72 проц.

Зусім дрэнна выканваецца плян мабілізацыі сродкаў па лініі спажывецкай каапэрацыі БССР. Заходняя вобласьць выканала фінплян спажывецкай каапэрацыі на 163 проц., БССР толькі на 84 проц.

У той час, як па Заходняй вобласьці плян уцягненьня ўкладаў у ашчадкасы выкананы на 93 проц., па БССР — толькі на 28 проц.

Раённыя арганізацыі БССР павінны тэрмінова падцягнуцца і дабіцца поўнага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў. Дагавор па сацпаборніцтве паміж БССР і Заходняй вобласьцю павінен быць поўнасьцю ажыцьцёўлен.

Чэрыкаў—у глыбокім тылу

Чэрыкаўскі раён на працягу ўсіх трох кварталаў ня выходзіць з глыбокага фінансавага прарыву. Чэрыкаўскі раён—адзін з тых раёнаў, якія ўвесь час зрываюць выкананьне фінпляну па БССР.

План першага кварталу выканан на 51,3 проц., другога—на 61,6 проц., трэцяга—на 64,8 проц. Становішча не палепшылася і ў чацьвёртым квартале. Кастрычніцкі плян выканан толькі на **54 проц.** Зусім дрэнна стаіць справа з укладамі ў ашчадкасы. Замест прыліву 6.000 руб., кастрычнік даў адліў укладаў на 700 руб. Плян рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў выканан на 34,6 проц., па паявых узносах у каапэрацыю на 14,2 проц., па акцыях Трактарацэнтру—11,3 проц.

Недапушчальна зацягнулася спагнальне абавязковых плацяжоў з кулацкіх гаспадарак. Усё гэта сьведчыць аб тым, што раён ня ўключыўся ў фінэстафэту.

Цікава адзначыць той факт, што першае арганізацыйнае пасяджэньне раённага штабу фінэстафэты адбылося толькі 3-га лістапада.

Раённая камісія садзейнасьці дзярж крэдыту на працягу трох месяцаў ня мела піводнага пасяджэньня. Камісіі садзейнасьці ў большасьці сельсаветаў не працуюць.

Масавая работа вакол рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы» і ашчаднай справы не вядзецца. Грамадзкія арганізацыі ня прыцягнуты да барацьбы за выкананьне фінпляну. Сакратар райкому КСМ тав. **Рыбакоў**, ня гледзячы на ясныя дырэктывы ЦК, ня даў ніякіх указаньняў ячэйкам аб пра вядзеньні фінэстафэты.

ЛЬВОЎ.

Адсталыя раёны —на буксір!

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў

Заслухаўшы паведамленьне Народнага камісара фінансаў БССР т. **ХАЦКЕВІЧА** аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў у чацьвертым квартале і аб адставаньні паасобных раёнаў, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адзначаючы, што **АСЬВЕЙСКІ, КЛІЧАЎСКІ, КАПЫЛЬСКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, ЛОЕЎСКІ, НАРАЎЛЯНСКІ, СТАРАДАРОСКІ, ТУРАЎСКІ і ЧЭРВЕНЬСКІ** раёны на працягу году з кварталу ў квартал сыстэматычна адстаюць у выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў і што плян на кастрычнік імі выкананы менш як на 50 проц., катэгарычна патрабаваць ад РВК і паляпшэньня раёнаў перабудаваць работу і забясьпечыць рашучы пералом у выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў.

2. Адказнасьць за ўжыцьцё адпаведных мер усклаць персанальна на старшынь РВК і загадчыкаў райфа: Асьвейскага—на тав. **ГРЫЦКЕВІЧА** і тав. **СЯЛЯГА**; Клічаўскага — на т. т. **РАЖАДА і КАНДРУКОВІЧА**; Капыльскага — на т. т. **ЦАХОЎСКАГА і БЕГЛЯКОВА**; Чырвонапольскага—на т. т. **ГРЫШКЕВІЧА і КАРНЕЙЧЫКА**; Лоеўскага — на т. т. **ДАБРЫНСКАГА і ПАЛУБІНСКАГА**; Нараўлянскага —на т. т. **КОРСАКА і АНСІОЧЫНКА**; Старадароскага—на т. т. **БАРСУКОВА і І

Крывавыя баі за Цыцыкар

Акупанты пасылаюць новыя сілы ў Манчжурыю

Наступленьне шырокім фронтам на Цыцыкар

ТОКІЁ, 13. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе з Мукдэну аб наступленьні генэрала Чан Хай-пэна (японскі стаўленьнік) на Цыцыкар. Войска Чан Хай-пэна заняло Цьзінсінчэн — буйны горад на Паўночным захадзе ад Тайлай, аддзяляючы войска генэрала Ма. На станцыі Фуляэрдзі, на лініі Кітайскай Усходняй чыгункі ўчора была чутна кананада, якая сьведчыць аб буйных баёх паміж войскамі генэрала Чан Хай-пэна і Ма.

(ТАСС).

Новая нота Кітая Лізе Нацый

БЭРЛІН, 13. Прадстаўнік Кітая пры Лізе Нацый Шы зьвярнуўся да старшыні рады Лігі Нацый Брыяну з нотай, у якой зазначае, што 12 лістапада ўраду правіцы Хэйлунцзян быў прад'яўлен генэралам Хандзіо ультыматум, у якім японіі прапануе кіраўніку правіцыяльнага ўраду безадкладна падацца ў адстаўку і эвакуаваць Цыцыкар. Японскае войска зьбіраецца, паводле слоў кітайскай ноты, заняць Цыцыкар. Кітайскае войска адступіла да Чайпанцы, 17 вёрст ад Даесінскага вакзалу. Вакзал у сучасны момант знаходзіцца ў руках японцаў.

Брыян непакоіцца аб становішчы японскіх войск

ТОКІЁ, 13. Міністэрствам замежных спраў атрымана другая нота Брыяна з запытаньнем аб работах па рацэ Ноні. Брыян патрабуе спыненьня ваенных дзеньняў і прадстаўленьня магчымасьці наглядальнікам Лігі Нацый абсьледаваць становішча на месцы.

Адказ паўтарае вэрсію нібы кітайская ўлада згуртавала ў раёне Цыцыкара-Анандзі ў 10 раз больш войска, чым Японія і што пагражаючае становішча японскіх войск кожную хвіліну пагаршаецца. Адносна пасылкі наглядальнікаў Лігай Нацый у адказе паведамляецца, што Японія гатова па-ранейшаму забясьпечыць Лігу Нацый інфармацыяй і падоўжыць магчымасьць прадстаўніком дзяржаў азнаямленьня са становішчам на месцы.

(ТАСС).

Японія пагражае захватам Цянь-Цьзіня

ШАНХАЙ, 13. Японскі пасол у Панкіне Сігеміцу перадаў панкінскаму ўраду ноту з прычыны падзей у Цянь-Цьзіне. Нота абвінавачвае Кітай у невыкананьні данага ў лістопадзе 1902 году абавязацельства ня трымаць кітайскіх войск і не праводзіць перасоўваньня іх у раёне разьмяшчэньня чужаземных войск, радыусам у 20 кітайскіх лі. У сувязі з гэтым, нота ўскладае адказнасьць за падзеі ў Цянь-Цьзіне на Кітай.

Нота патрабуе безадкладнага вываду кітайскіх войск з паказанага раёну, прычым папярэджвае, што калі войска не будзе выведзена - заражка, дык Японія прыме «неабходныя меры для абароны японскай канцэсіі ў Цянь-Цьзіне».

Сакрэтныя перагаворы паміж Японіяй і ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК, 11. «Дэйлі Уоркер» абвінавачвае Стымсона ў сакрэтнай дагаворанасьці паміж Японіяй і Амэрыкай, прычым ПАЗШ згадзілася на японскую акупацыю Манчжурыі. Газэта патрабуе апублікаваньня пядаўніх амэрыканскіх нот Японіі.

***

ВАШЫНГТОН, 12. Таварыш міністра замежных спраў ПАЗШ Кэстль заявіў, што антымізм дзяржаўнага дэпартаманту (міністэрства замежных спраў) адносна перспэктыў вырашэньня манчжурскага канфлікту аснован на тым, што на парыскай сэсіі рады Лігі Нацый будзе высунут «кампрамісны плян» вырашэньня манчжурскай праблемы. Ня гледзячы на афіцыяльны антымізм, чыноўнікі дзяржаўнага дэпартаманту прызнаюць, што лягчэй было акупаваць Манчжурыю, чым цяпер увесьці войскі адтуль. Палітыка дзяржаўнага дэпартаманту ў даны момант характарызуецца тым, што дзяржаўны дэпартамант амаль безагаворачна прымае ўсе японскія дыпляматычныя запэўненьні, ігнаруючы перасоўваньне японскіх войск, якое зараз адбываецца.

Японская ваеншчына патрабуе эвакуацыі Цыцыкара

БЭЙПІН, 13. Генэрал Ма паведаміў па радыё Чжан Сюэ-ляну, што невядомы японец, які заявіў, што ён зьяўляецца прадстаўніком камандуючага японскай арміяй Хандзіо, паведаў яго 12 лістапада раніцаю і вусна патрабаваў, каб Ма эвакуяваў Цыцыкар да поўначы таго-ж дня. Ма прасіў японца прадставіць дакументы, якія пацьвярджалі-б, што ён зьяўляецца прадстаўніком Хондзіо, а таксама патрабаваў тлумачэньня, ці ўнаўважае Хандзіо абвясьціць вайну ад імя японскага ўраду. Праз некалькі гадзін пасьля гэтага ультыматыму японская кавалерыя і артылерыя пачалі бой супроць кітайскай артылерыі і кавалерыі. Ма паведаміў, што за японіяй некалькі дзён яго ня раз наведвалі розныя японскія агенты, дамагаючыся выводу кітайскіх войск з Цыцыкара.

У пазьнейшым паведамленьні Ма зазначыў, што японскі агент вярнуўся з тэлеграмай, падпісанай Хандзіо, у якой патрабавалася ад Ма вывесьці войскі з Цыцыкара. Ма паведамляе, што японскія войскі пад выглядам абароны чыгункі Таснань-Анандзі маюць намер захапіць Анандзі.

Пабудова аэрадрому ў Мукдэне

ТОКІЁ, 13. Як падае газэта «Асахі» ўчора ў Мукдэн накіраваны самалёты ў суправаджэньні афіцэраў авіяшколы ў Сімасідзе (прафэктуры Цыба). Адтуль-жа накіраваны рабочыя авіямайстэрань у Квантунскую армію. Газэта «Хоці» піша, што на аэрадроме Каганігахара (у прафэктуры Гіфу) выбрана некалькі мэханікаў для адпраўкі ў Мукдэн.

Адпраўка авіяпалка ў Манчжурыю

ТОКІЁ, 13. Ваенная ўлада загадала авіяпалку адправіць у Манчжурыю самалёты з прычыны страт, якія панесены нінгянскім авіяпалком, высланым у Манчжурыі з Карэі ў пачатку манчжурскага канфлікту.

Кампартыя Германіі ў барацьбе за чыстату сваіх радоў

Пастанова ЦК КПГ

БЭРЛІН, 13. Камуністычны друк Германіі публікуе пастанову ЦК кампартыі Германіі, у якой, між іншым, гаворыцца:

«Унутры партыі галоўнай небясьпекай для правядзеньня генэральнай лініі, для заваяваньня большасьці рабочае клясы зьяўляецца правы апартунізм і адступленьні перад буржуазіяй і яе галоўнай сацыяльнай апорай сацыял-дэмакратыяй.

У той-жа час сур'ёзную небясьпеку прадстаўляюць і праяўленьні «левых» сэктанцкіх настрояў, накіраваных супроць масавай работы кампартыі. «Левая» небясьпека ў рэвалюцыйным рабочым руху выяўляецца, між іншым, у праяўленьні тэрарыстычных настрояў, ва ўжываньні індывідуальнага тэрору супроць фашыстаў, у правядзеньні бессапсоўных індывідуальных выступленьняў, ва ўзброеных індывідуальных нападах і ў авантурыцкай гульні з выбуховымі матэрыямі.

ЦК канстатуе, што такія тэндэнцыі ня маюць нічога супольнага з камунізмам і розка супярэчаць таму цьвёрдаму фундаманту, на якім Маркс і Энгельс будавалі стратэгію і тактыку рэвалюцыйнага рабочага руху. Такія тэндэнцыі розка супярэчаць таксама праграме Камінтэрну, якая катэгарычна асуджае «пранаганду ўжываньня індывідуальнага тэрору, бо «індывідуальны тэрор» адцягвае пралетарыят ад мэтадаў масавай арганізацыі і масавай барацьбы».

Не адмаўляючыся ні на хвіліну ад ужываньня ўсіх мэтазгодных сродкаў барацьбы, не абмяжоўваючы ні ў якай ступені камуністычных лёзунгаў аб арганізацыі пралетарскай масавай самаабароны супроць фашысцкіх нападаў, ЦК кампартыі Германіі заяўляе, што **ўсякая абарона тэрарыстычнай ідэалёгіі і прымірэнчыя адносіны да яе на практыцы зусім недапушчальны.** Той, хто дае сябе захапіць настроям роспачы і хто выпрацоўвае сваю тактыку пад дыктоўку ворагаў пралетарыяту, той, хто паддаецца фашысцкім патрабаваньням і парушае дысцыпліну, — **ня варты годнасьці камуніста.**

ЦК кампартыі Германіі папамінае ўсім членам партыі і рэвалюцыйным рабочым аб бясспрэчна даказаным 60-цігадовым вопытам марксыцкага рабочага руху факце, што ўсе анархісцкія і тэрарыстычныя імкненьні служаць толькі для таго, каб адцягнуць рабочыя масы ад масавай барацьбы, адштурхнуць мільённыя масы ад рэвалюцыйнага авангарду, палегчыць правакатарам іх брудную работу і стварыць яркія невады для буржуазнага цкаваньня кампартыі.

ЦК кампартыі Германіі абавязвае ўсіх членаў партыі непахісна дзейнічаць у сэнсе гэтай пастановы і **бязьлітасна змагацца супроць усякага ўхілу ад гэтай лініі.** Інтарэсы рабочае клясы, інтарэсы пралетарскай рэвалюцыі патрабуюць, каб супроць усякага парушальніка гэтай пастановы ўжываліся самыя рашучыя дысцыплінарныя меры аж да выключэньня з радоў партыі». (ТАСС).

„Мы павядзем францускі пралетарыят па шляху пралетарыяту СССР“

ПАРЫЖ, 10. На зьезьдзе унітарнай канфэдэрацыі працы ў спрэчках па дакладу тав. **Маммусо** гаварыў: Паўночная Францыя Вантэле выкрывае палітыку рэфармістаў, якая заключалася ў правяденьні ахвяр для зьмякчэньня эканамічнага крызісу, і падкрэсьлівае, што апартуністычная апазыцыя на справе вядзе тую-ж лінію, што і рэфармісты. Потым апартуністычная апазыцыя прравакуе інцыдэнт, патрабуючы, каб ім далі 8 гадзін у спрэчках па дакладу тав. Маммусо. Кангрэс большасьцю 700 галасоў супроць 20-ці адхіляе патрабаваньне мінарытарыяў (апартуністычная апазыцыя).

Пасьля ў якасьці дэлегата ад гарнякоў Поўначы выступіў прывітаньні ваенцыян генэральны сакратар ЦК францускай кампартыі тав. **Торэз**, які ў сваёй прамове падкрэсьліў неабходнасьць асаблівай увагі да пытаньня непасрэднай абароны падаткаў патрабаваньняў рабочых, не выключаючы самых мінімальных. Прамова тав. Торэз зрабіла вялізнае ўражаньне на дэлегатаў зьезду сваёй выразнасьцю.

З заключным словам выступіў тав. Маммусо. Адказваючы адному з «лідэраў» мінарытарыяў Бовілю, які заявіў, што большасьць унітарных прафсаюзаў знаходзіцца ў «падпарадкаваньні СССР», тав. Маммусо сказаў: «Гэта стары аргумант буржуазіі. Так, мы ідзем разам з рускім пралетарыятам. Змагаючыся за свае інтарэсы, мы змагаемся за СССР. Мы павядзем францускі пралетарыят па шляху пралетарыяту СССР».

Гэта заява тав. Маммусо была сустрэта бурнымі воплескамі і пляньнем «Інтэрнацыяналу». Вынікі галасаваньня па дакладу тав. Маммусо аб дзейнасьці унітарнай канфэдэрацыі працы наступныя: 1.327 прафсаюзаў галасавалі за, 191 супроць і 7 устрымаліся.

„Як гіне Эўропа“

Артыкул Лёйд-Джорджа

ВЕНА. У «Нэйе фрэйе прэсэ» надрукаваны 8-га лістапада новы артыкул Лёйд-Джорджа пад славутым загалоўкам: «Як гіне Эўропа».

Характарызуючы ў гэтым артыкуле катастрафічнае становішча капіталістычнай Эўропы, Лёйд-Джорджа спыняецца, перш за ўсё, на яе запазычанасьці. «Увесь дзяржаўны доўг ПАЗШ, — піша ён, — складае каля 16 млрд. даляраў, з якіх звыш 11 млрд. пакрываюцца ваеннымі пазыкамі, якія належаць Амэрыцы. Наадварот, адзін толькі доўг унутраны Англіі перавышае 30 млрд. даляраў. Ня гледзячы на інфляцыю, якая спрыяла ліквідацыі даваенных і ўнутраных даўгоў Нямеччыны, Францыі, Бэльгіі і Італіі, агульная запазычанасьць Эўропы дасягае сумы, якая ў шмат раз перавышае лічбу амэрыканскага нацыянальнага доўгу».

Ня гледзячы на цяжкае ярмо запазычанасьці, капіталістычныя дзяржавы трацяць вялізарныя сродкі на ліхаманкавыя ўзбраеньні, якія складаюць каля 2,5 млрд. даляраў у год: «На ПАЗШ, — гаворыць Лёйд-Джордж, — прыходзіцца каля 35 проц. агульнасусьветнага даходу й амаль 17 проц. усіх сусьветных расходаў на ўзбраеньне. На Эўропу, якая атрымлівае прыблізна такі-ж процант сусьветнага даходу, але павінна ўтрымліваць за кошт гэтага даходу ў тры разы больш насельніцтва, чым ПАЗШ, прыходзіцца 66 проц. сусьветных выдаткаў на ўзбраеньне».

«У выніку, — піша Лёйд-Джордж, — ня прыходзіцца дзівіцца таму, што ў апошні час гаспадарчае становішча Эўропы стала зусім хворым. Адна дзяржава за другой хісталіся на краі бяздоньня... Ярмо запазычанасьці, мытныя войны і выкліканыя страхам узбраеньні былі перашкодай для ўсякага ўстойлівага аздараўленьня Эўропы і прывялі ўрэшце да нямінучага агульнага краху. У адной краіне за другой банкі спынялі плацяжы, у бюджэтах аказваліся зьявочыя дэфіцыты, у прамысловасьці зьнікла яе занятасьць работай, беспрацоўе расло, і цяпер здань банкрутства паўстала перад народам. Сумны малюнак! Але ён яшчэ ня поўны... Ва многіх краінах заработная плата мела мізэрныя разьмеры нават у добрыя часы, а калі, як цяпер, панае ўзросшае беспрацоўе і вострая дэпрэсія паралізуе прамысловасьць, голад крочыць па хатах беднякоў. Калі будзе расьці беспрацоўе, а разам з ім — меры эканоміі і падатковае ярмо, дык цэнтральная Эўропе пагражае найвялікшая небясьпека пагрузіцца ў мора хаосу, рэвалюцыі і экспэрымэнтаў».

Лёйд-Джордж думае, што перагляд міжнародных даўгоў і зьнішчэньне мытных бар'ераў можа прынесьці капіталістычнай Эўропе ратунак. Гэты рацэпт, зразумела, ніколькі ня лепшы за іншыя буржуазныя «сродкі ратаваньня», і нарысаваны самім Лёйд-Джорджам малюнак даволі пераканаўча гаворыць аб немагчымасьці іх ажыцьцяўленьня і бясплённасьці.

(«Известия»).

Партыйнае будаўніцтва

КАДРЫ ВЯСКОВЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

Сёньня папаўняюцца 125 выпускнікамі курсаў партактыву пры ЦК КП(б)Б

Бальшавіцкае прывітаньне выпускнікам

У дзень выпуску 6-цімесячных курсаў Райпартактыву 1-га скліканьня — бальшавіцкае прывітаньне 125-ці таварышом, якія адпраўляюцца ў раёны БССР на кіруючую партыйна-савецкую работу.

ЦК КП(б)Б упэўнен, што ўсе выпускніі будуць бязьлітасна змагацца за генэральную лінію партыі, за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных задач.

Сакратар ЦК КП(б)Б — Гей.

Першы выпуск курсаў райпартактыву

Сёньня адбываецца першы выпуск 125 таварышоў, якія скончылі 6-месячныя курсы падрыхтоўкі кіруючага раённага партактыву пры ЦК КП(б)Б.

Як сама арганізацыя курсаў, так і сёньнішні выпуск маюць вялізарнае значэньне ў сыстэме тых мерапрыемстваў, якія праводзіць партыя па падрыхтоўцы кіруючых партыйных кадраў для вёскі.

Вялікія посьпехі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, далейшыя задачы па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, па аўладаньні тэхнікай с.-г. вытворчасьці, на павышэньні якасьці работы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ад усіх зьвеньняў партыйнай арганізацыі на вёсцы карэннай перабудовы работы і канкрэтызацыі кіраўніцтва. Для кіруючай партыйнай работы на вёсцы патрэбны вытрыманыя бальшавікі, загартаваныя ў змаганьні за генэральную лінію партыі, здольныя арганізаваць масы на барацьбу за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Накіраваньне 25-ці тысяч рабочых на вёску, ліквідацыя акруг і пасылка ў раёны асноўнай масы акруговых работнікаў — важнейшыя мерапрыемствы па ўзмацненьні кадрамі ўсіх вучастках работы на вёсцы. Аднак, гэтыя мерапрыемствы яшчэ не здавальняюць тых патрэб, якія з кожным днём ўсё ўзрастаюць. У мэтах яшчэ большага ўзмацненьня кадрамі вясковых арганізацый, орграбюро ЦК УсеКП(б) прыняло пастанову аб арганізацыі крайкомамі і ЦК нацкампартый сетні курсаў па падрыхтоўцы кадраў са складу вясковых партарганізацый, з людзей, якія прайшлі школу клясавай барацьбы, якія маюць вопыт у практычнай рэбоце. У мэтах рэалізацыі гэтай пастановы **ЦК КП(б)Б арганізаваў курсы райпартактыву,** першы выпуск іх мы сёньня адзначаем.

Першае скліканьне курсаў, што сёньня выпускаецца, паказала, наколькі сваячасовай і мэтазгоднай зьяўляецца іх арганізацыя. Раённыя камітэты партыі камандыравалі на гэтыя курсы пераважна таварышоў з вялікім стажам практычнай візавой і раённай кіруючай работы. З агульнага ліку курсантаў 10 таварышоў працавалі на раённай партрабоце, 18 на адміністрацыйна-савецкай і 24 на гаспадарча-каапэрацыйнай рабоце раённага маштабу. Іншыя таварышы былі ўзяты з візавой партыйнай савецкай і гаспадарчай работы.

Слухачы ў часе працы курсаў сумяшчалі тэарэтычную вучобу з практычнай. Штодзённа аддаючы восьмь гадзін на прапрацоўку вучэбнага матар'ялу, курсанты прымалі актыўны ўдзел у практычным ажыцьцяўленьні тых гаспадарча-палітычных задач, якія на даным этапе ставіць партыя. У парадку тэарэтычнай вучобы курсанты прапрацавалі пытаньні **гісторыі партыі, асноўныя праблемы ленінізму, пытаньні партыйнага будаўніцтва, палітэканоміі, эканомпалітыкі, міжнароднага становішча і пытаньні аўладаньня тэхнікай сельска-гаспадарчай вытворчасьці.**

Курсанты на працягу 20 дзён прымалі ўдзел у рабоце па камплектаваньні сьвінагадоўчых, жывёлагадоўчых і інш. таварных фэрм у калгасах.

Іх практычная работа нікольні не перашкаджала тэарэтычнай вучобе. Вучэбны плян курсаў, праграмы выканалі поўнасьцю.

Слухачы павысілі свой тэарэтычны ўзровень, падкавалі слабе на асноўных пытаньнях марксызму-ленінізму. Зразумела, што гэтыя сілы зараз можна скарыстаць значна лепш. Калі ж курсаў большасьць таварышоў працавала на вясковай рабоце, то зараз звыш 70 таварышоў з ліку тых, якія канчаюць пойдуць на працу раённага маштэбу, прычым у большасьці на партработу. 33 таварышы будуць скарыстаны ў апаратах райкомаў партыі і раённых кантрольных камісій, 6 таварышоў — на газэтнай працы, 35 таварышоў на кіруючай рабоце ў сельпарткомах і ў партыйных камітэтах прамысловых прадпрыемстваў. Звыш 30 таварышоў будуць скарыстаны на адказнай савецка-гаспадарчай і каапэрацыйнай рабоце.

Выпускніком неабходна памятаць, што тыя веды, якія яны атрымалі на курсах, неабходна штодзённа павышаць далейшай самастойнай працай, а галоўнае, што іх неабходна скарыстоўваць у сваёй практычнай працы, падымаючы кожнае практычнае пытаньне на прынцыповую вышыню, бязьлітасна змагаючыся з усякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі.

Таварышы, якія скончылі курсы, павінны быць пачынальнікамі ў барацьбе за перабудову ўсёй нашай работы, у барацьбе за ўзмацненьне вясковых партарганізацый, за павышэньне авангарднай ролі камуністаў па ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Нядаўна сакратарыят ЦК КП(б)Б вынес пастанову, што шасьцімесячныя курсы кіруючага раённага партыйнага актыву зьяўляюцца **пастаяннымі курсамі.**

ЦК КП(б)Б устанавіў кантынгент курсантаў у 250 асоб. Гэта абавязвае РК партыі больш сур'ёзна падыходзіць да пытаньня камплектаваньня курсаў, да адбору на курсы найбольш вытрыманых таварышоў. Неабходна забясьпечыць ня менш 70 проц. у складзе курсантаў рабочых і ня менш 25 проц. жанчын. Кожны раённы камітэт партыі навінен поўнасьцю выканаць расклад ЦК па камплектаваньні гэтых курсаў.

Манэўскі, Зйдзэльман.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Рапарт шаўковай фабрыкі

ЗА ЧАС ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ФІНЭСТАФЭТЫ МАГІЛЕЎСКАЯ **ШАЎКОВАЯ ФАБРЫКА** ІМЯ КУЙБЫШАВА ДАБІЛАСЯ НАСТУПНЫХ ПОСЬПЕХАЎ:

АРГАНІЗАВАНЫ 22 БРЫГАДЫ. ПРАВЕДЗЕНА 11 СХОДАЎ І 18 ГУТАРАК ПА ПЫТАНЬНІ ФІНЭСТАФЭТЫ. АХОПЛЕНА КАСАЙ АШЧАДНАСЬЦІ 654 РАБОЧЫХ НА СУМУ 14.900 РУБЛЁЎ. ПРАВЕДЗЕНА ДАДАТКОВАЯ ПАДПІСКА ПА ПАЗЫКУ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ», ЯКОЙ АХОПЛЕНА 114 НОВЫХ РАБОЧЫХ. ЛІКВІДАВАНА ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ ПА ЧЛЕНСКІХ УЗНОСАХ.

ВЫКЛІКАЕМ НА САЦСПАБОРНІЦТВА ПА ЛЕПШЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ФІНЭСТАФЭТЫ ШВЭЙНУЮ ФАБРЫКУ.

ШТАБ ФІНЭСТАФЭТЫ ШАЎКОВАЙ ФАБРЫКІ.

Пушчан мэталяапрацоўчы камбінат

У дні Кастрычніцкіх сьвят у Магілеве пушчан вялікі мэталяапрацоўчы камбінат прамысловай каапэрацыі. З дня закладкі фундаманту да пуску прайшло толькі 6 месяцаў. Такіх нячуваных тэмпаў будаўнікі дабіліся дзякуючы вялікаму энтузіязму і разгортваньню сацспаборніцтва на будоўлі.

Усебеларуская канфэрэнцыя фабзавучаў

У канцы лістапада ў Менску адбудзецца ўсебеларуская канфэрэнцыя фабзавучаў. У канфэрэнцыі прымуць удзел 150 дэлегатаў ФЗВ і рабочыя-ўдарнікі.

Асноўныя пытаньні канфэрэнцыі — падрыхтоўка кадраў і роля фабзавучаў, грамадзка-палітычнае выхаваньне ў ФЗВ і г. д.

Праезд замежных рабочых дэлегацый

НЕГАРЗЛАЕ. (БелТА). 10 лістапада праехала за мяжу дэлегацыя галяндзкіх рабочых-чыгуначнікаў. У гутарны з карэспандэнтам БелТА дэлегаты выказалі вялікую радасьць з прычыны таго, што пабывалі ў СССР і азнаёміліся з сацыялістычным будаўніцтвам у Савецкім Саюзе. Дэлегацыя наведала Масква, Сталінград, гарады УССР і каўкаскія курорты.

Дэлегаты абяцалі расказаць галяндзкім рабочым усю праўду аб савецкай краіне.

18 чырвоных абозаў — за тры дні

ЕЛЬСК. (БелТА). Дзякуючы разгорнутай масава-растлумачальнай рабоце за 6, 7 і 8 лістапада на Скарнянскім сельсавеце было арганізавана 18 чырвоных абозаў, якія здалі дзяржаве некалькі сотень тон бульбы, збожжа і ільнасемя.

Адкрыты вячэрні заводзкі тэхнікум

Паводле ініцыятывы заводу «Камунар» ВСНГ адкрыў у Менску вячэрні заводзкі тэхнікум па халоднай і гарачай апрацоўцы мэталю. Тэхнікум рыхтуе прарабаў мэталёвай вытворчасьці, канструктараў і тэхнікаў па лінейных і штамповачных работах.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Вынаходка машыніста Юрчына

КІЕЎ, 10. Выпрабаваньне выпайдзенага машыністам кіеўскага дэпо Юрчыным прыбору для выключэньня поршняў і залатнікоў на паравозе, зробленае пры ўдзеле выдатных спэцыялістаў і прадстаўнікоў дырэкцыі паўдніёва-заходніх чыгунак, дало бліскучыя вынікі. Паравоз, на якім былі ўстаноўлены ў часе выпрабаваньня прыборы Юрчына, лёгка давёў хуткасьць да 55 клм. у час, уключаючы і выключаючы машыну на-ходу. На думцы буйнейшых спэцыялістаў, вынаходства Юрчына зробіць рэвалюцыю ў паравозным тэхніцы і мае сусьветнае значэньне. Дагэтуль усе спробы замежных транспартнікаў скансструяваць прыбор, які даў-бы магчымасьць знайсьці мёртвы пункт і скампэнсаваць на ім рэшткі ўсіх паравых механізмаў пры поўным ходзе паравоза зіставаліся безрэзультатнымі.

Сход ударнікаў кіеўскага дэпо ўзьняў хадайніцтва аб узнагароджэньні Юрчына ордэнам Леніна.

Паведамленьні

— **Дом письменьніка.** 15 лістапада, у 7 гадзін вечара адбудзецца **зьлёт рабочых-ударнікаў, заняпіканых у літаратуру.** Парадак дня: 1. Асноўныя задачы канфэрэнцыі МенАПП (т. А. Александровіч), 2. Аб творчасьці рабочых-ударнікаў (тав. Кунітскі), 3. Чытка твораў рабочымі-ўдарнікамі. Прысутнасьць членаў літгурткоў МенАПП абавязковая.

У БДТ 1.

15-га лістапада г.г. у памяшканьні тэатру (фойе) а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца дыспут аб апошняй пастаноўцы БДТ1 — **«Справа гонару».**

На дыспут запрашаюцца пісьменьнікі, работнікі рэдакцый газэт, ударнікі і шырокая пралетарская грамадзкасьць гораду.

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў т. Бабруйску 19/XI і 20/XI і ў г. Жлобіне 21/XI і 22/XI у 10 гадз. раніцы будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б над старшынствам т. Сухаранда. На ПТ выклікаюцца наступныя т.т.: **на 19/XI — (Бабруйск):** Караткевіч Г. А., Зубер Л. М., Калбасьнікаў Ш. М., Ручкоўскі А. Ф., Федаровіч Ю. І., Ліс С. Я., Царык М., Бетельман Л. М., Бокі І. Я., Эліп Б. Д., Аляшкевіч П. О. — Бабруйск. **На 20/XI — (Бабруйск):** Матіясінскі Г. Я., Гаролік В. С. (Парычы), Давідзюк В. Х. (Бабруйск), Пятровіч М. П., Адынец П. П., Валодзька У. В., Марціновіч М. С., Якубенак К. І. — (Глуск). **На 21/XI у г. Жлобіне:** Курдо М. В., Кавалёў М. С., Гайда С., Шкірман П. І., Бежалёў І. М., Корзун А. П., Латкоў Ю. Я. — (Жлобін), Казлоўскі М. М. — (Рагачоў), Ільлеў С. Т., Куроцін Д. П., Крыжаў Р. П. — (Выхаў). **На 22/XI у г Жлобіне:** Пазьнякоў П., Янкулін Р. М., Сасонка Ш., Каталаў П. Ф., Шарфун Я. І., Ланкоўскі Н. С., Сілаўёў А. Я., Маскалёў Г. М. (Выхаў), Шпалеткаў Я. С., Ізілеўская С. Г. (Карма). Пажадана прысутнасьць сакратароў парт. ячэек, на вучоце якіх лічацца паказаныя таварышы, і прадстаўнікі РКК КП(б)Б.

— 14-га лістапада, у 7 гадз. вечара Культпропам ЦК скліканецца нарада экаманістаў-марксыстаў.

— 14-га лістапада, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні Камвузу, пакой 25, адбудзецца насяджэньне т-ва гісторыкаў-марксыстаў. Будзе праняты справаздачны даклад т. Дудкова і дыскусія т. Чарняўскага.

— 14/XI г.г., у 6 гадз. веч., у памяшканьні гарсавету (малая зала) адбудзецца пасяджэньне бюро скарнікаў ЦКК НК РСІ БССР з разглядам паступлых справаў: 1) Выніні брыгад на правэрцы жакпаў, як яны своячасова скончылі рамонт; 2) Справа аб начной сапсоры. Усе прадстаўнікі, якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі: Любін, Ілеенко, Паўловіч, Гутман, Казлоўская, Берман — шпатачный ф-кі, Міхайлаў, Шпакаў — вав. «ДА», Марцевіч, Ждановіч — дапо, Вялічка, Шамко, Розенгаўз — шпалерная ф-ка, Савіч, Гладкі — малочны завод. Таксама запрашаюцца ўсе рабочыя засядацелі бюро скаргаў. Выклікаюцца старшыня Белжылсаюзу, Гаржылсаюзу, старшыні жакпаў № 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12 да 40. Запрашаюцца прадстаўнікі газэты «Зьвязда», «Рабочнік», а таксама актыў «ЛК» і рабкоры.

— Партгрупка Мен. Гар. НК КП(б)Б выклікае на 15-е лістапада г.г. у 6 гадзін веч. (вул. Энгельса, 28, пакой 14) наступных т.т.: Касьцюка С. М., Калмова П. Я. (Менбуд), Сокалаў Д. С. (з-д «Комунар»), Ноіма (ВСНГ), Жунціна (Зелдзіпрэбуд), Пікіцына С. А. (Транспартгрэс), Мухіна С. (мэдтэхнікум), Місьлічэнка П. (Вадаканалтрэст), Бабкова М. (НКЮ), Атаўчэнка П. К. (б. Віцебскай ар-цыі), Іваўліча П. К. (б. Віцебскай ар-цыі), Іваўкевіча, Іванова (ф-ка «Учільскур»), Нікевікаў М. (курсы райпартактыву), Нісенбаум (драж. завод), Буракоў А. Ф. (саўгас Лесерта), Якавенка (лямцавая ф-ка), Леанцвіч В. Г. (хэмфармазавод), Дарашэвіч (хэмфармазавод), Вараб'ёў М. (партгалектыў міліцыі), Каллоў В. Н. (ф-ка «Кастрычнік»), Копець Р. М. (Гаржылсаюз), Аваловаво Е. І. («Чырвоны хэмік»), Мухавошчык (з-д «Варашылава»), Рудзіцкі (з-д «Камунар»), Бароўна Н. С., Заштофт С. К. для ўдзелу ў разглядзе справы.

Таксама выклікаюцца сакратары ячэек, дзе гэтыя т.т. лічацца на вучоце. Явка абавязковая.

Адказны рэдактар **С. БУДЗІНСКІ.**

Чырв. Зорка. Пач. 6, 8-20, 10-30. Гаваручы гукавы фільм **ЗЛАТЫЯ ГОРЫ**

„КУЛЬТУРА“. Пач. 7, 8-45, 10-30. 1) **Ёрпікая бяда Неаляпай манчыны** 2) **Электрозавод** Культурфільм

„Інтэрнацыянал“. Замежны фільм **Нахсьмы і спорт** ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: **Буржуасьным 3-х рэвалюцый**

ПРАЛЕТАРЫ. **Бэстэр котон** у фільме **АПАНТАНЫ** у 6 ч. Звыш праграмы **БАЛХАШ** у 2 ч.

„Юны Піанэр“ (Будынак кіно „Культура“). Арыгінальная камэдыя **„Два друга, модель и подруга“** Звыш праграмы — хроніка. Пач. 1 г., 2-30. Каса — ад 11 г. ран.

„СПАРТАК“. Каса адкрыта ад 5 г. Выдатны фільм **ЧАЛАВЕК З ЛЕСУ** Драма ў частках

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ „ТОРГСИН“ да сканчэньня рамонту ўнівэрмага і галоўнай базы **АДКРЫВАЕ** 16 лістапада г. г. **часовую базу** ПА ВУЛ. ЛЕНІНА № 14, дзе будзе праводзіцца продаж і продаж ТАВАРАПРАДУКТАЎ УСІМ ГРАМАДЗЯНАМ, якія атрымліваюць пераводы з-за мяжы.

Кантора «ТОРГСИН» зьмяшчаецца: вул. Энгельса № 8, тэл. № 12—17.

Пры Менскай гарадзкой інспэкцыі Нарасьветы

АДКРЫВАЮЦЦА 6 МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ па падрыхтоўцы **дашкольных работнікаў**

Заявы прымаюцца ад работніц, жонак рабочых, калгасьніц і служачых.

Прымаюцца асобы, якія маюць асьвету за 5 груп сямігодкі.

Тэрмін падачы заяў **да 20-XI—31 г.** у памяшканьні Гарсавету (пляц Волі) — дашкольнаму інспэктару (пакой № 16).

14 лістапада, у 7 гадзін веч., у памяшк. кутку неўсовых работнікаў (Комуністычная, 17) АДБУДЗЕЦЦА **ДЫСКУСІЙНЫ ВЕЧАР** **нашых настацкіх прац 4-й усебеларускай настацкай выстаўкі.**

Запрашаюцца настаўн. сп. бочых, газэтныя працаўнікі, пісьменьнікі, навуковыя працаўнікі, представнікі партыйных, камсамольскіх і савецкіх арганізацый.

Выстаўком.

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР адбудзецца **15-га лістапада, у 7 гадз. вечара, у пам. ЦК МОПР'у**

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Зацьвярджэньне фінпляну на 1932 г.
2. Выніні абсьледаваньня Койданоўскай і Вузьдзенскай арганізацый МОПР'у.
3. Аб ходзе рэалізацыі пазыкі.
4. Выніні папулярызацыі пастаноў 2-га пленуму ЦК МОПР'у СССР.
5. Аб месячніку мабілізацыі мопраўскіх сродкаў.

З прычыны важнасьці абгаварваньня пытаньняў, яўка ўсіх членаў і канд. прэзыдыуму і ЦК — абавязкова.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Запрашаюцца ўсе члены і кандыдаты Менскага гарадзкога Камітэту МОПР'у, а таксама актыў візавых ячэек.

Сакратар ЦК МОПР'у БССР **ЦУДЗІН.**

Штаб штурмавых атрадаў па правядзеньні суботняга чырвоных партызанаў і чырвонных гаардзейцаў г. Менску і ваколіц абавязкова без спазьненьня.

Нам. Нач. Штурм. **Фіяльчэнка.**

Далоў чаргі — У КІНО — „Чырвоная Зорка!“

Ад 13 лістапада АДКРЫВАЕЦЦА ПАПЯРЭДНІ ПРОДАЖ БІЛЕТАЎ на вячэрнія сэансы ад 1. гадз. дня **ШТОДЗЕННА** **ДА ВЕДАМА ФАБЗАВУЧАЦЦАЎ** **Прым